# Гісторыя бібліятэк Сенненскага раёна

*складальнікі Т.М. Красноўская, К.В. Догіль, Н.Д. Зюзькова*

У павятовым горадзе Сянно не было ніводнай сярэдняй ці прафесійнай навучальнай установы. У цэнтры горада, на самым прыгожым месцы, узвышаліся касцёл, Мікалаеўскі сабор і Пакроўская царква. Культурна-асветных устаноў, адпавядаючых інтарэсам працоўных, не было. Невялікая колькасць кніг для чытання мелася пры Гарадскім сходзе (Дваранскім клубе) і народнай чайнай. Функцыяніравала прыватная бібліятэка Янкеля Левітана, за карыстанне кнігамі якой трэба было плаціць 15 капеек у месяц. Кніжныя фонды гэтых бібліятэк былі вельмі мізэрнымі. Найбольш передавая літаратура забаранялася і здымалася. Існуючыя бібліятэкі не былі даступныя для працоўных.

Да ўстанаўлення Савецкай улады ў Сенненскім павеце толькі 11% насельніцтва было пісьменным, у Сянно – 39%. Першыя бібліятэкі з’явіліся ў 1918 годзе. У 1919 годзе колькасць бібліятэк значна ўзрасла. У той час дзейнічалі 14 бібліятэк-чытален, 258 хат - чытален і адна цэнтральная ўездная бібліятэка. У пачатку 1921 года сетка бібліятэк павялічалася. Працавалі 3 бібліятэкі ў Сянно, 15 валасных бібліятэк і 273 хаты - чытальні.

Для ўмацавання ідэалагічнай работы сярод сялян валасныя бібліятэкі рэарганізуюцца ў хаты - чытальні. У Сенненскім уездзе засталося 13 бібліятэк.
У 1939 годзе функцыяніравала 96 бібліятэк. У перыяд нямецка - фашысцкай акупацыі ўсе кніжныя фонды былі знішчаны. Пасля Вялікай Айчыннай вайны бібліятэчная справа аднаўлялася. Па стану на 1 студзеня 1968 г. у раёне працавалі: 1 раённая, 2 дзіцячыя, 22 сельскія, 26 прыклубных, 12 калгасных, 4 прафсаюзныя і 42 школьныя бібліятэкі. Кніжны фонд усіх бібліятэк складаў 413915 экз. За 1967 год выдана літаратуры 492782 экз., налічвалася
35293 чытачы.

## Сенненская цэнтральная раённая бібліятэка



# Гісторыя бібліятэкі за годам год…

У дакументах Віцебскага губернскага і Сенненскага павятовага палітыка-асветных камітэтаў на 1 студзеня 1922 года ўказана, што цэнтральная бібліятэка горада Сянно адкрыта ў маі 1918 года. Першай загадчыцай бібліятэкі была Рэвека Саламонаўна Ліфшыц, якая мела сярэднюю адукацыю і з'яўлялася членам РКП (б).

**Снежань 1918 года.** У бібліятэцы было 800 кніг, якія знаходзіліся ў хаатычным беспарадку.

**1920 год.** Бібліятэка атрымала добрае памяшканне з двума пакоямі. Пры цэнтральнай бібліятэцы знаходзілася і дзіцячая, якая працавала самастойна.

**1922 год.** У студзені бібліятэка ўжо налічвала 8000 экз. кніг, з іх 300 кніг на польскай мове, 150 – на яўрэйскай, 300 – на французскай і 800 часопісаў. Дарослую і дзіцячую бібліятэкі абслугоўвалі 5 бібліятэкараў і 1 кур'ер.

**1924 год.** Бібліятэка пераведзена ў Нардом (былы дом ксёндза). Размяшчалася яна ў двух пакоях. Кніжны фонд складаў ужо 12762 экз. Было арганізавана ў бліжэйшых школах 18 перасовак. Загадчыкам Нардома і бібліятэкі быў І. Старыкевіч.

**1926 год.** Адкрыта чытальная зала, для якой выпісвалася 10 камплектаў газет.

**1936 год.** Пабудаваны двухпавярховы Дом культуры. У ім для раённай бібліятэкі былі выдзелены два вялікія пакоі на другім паверсе. У гэтым памяшканні яна знаходзілася да 1991 года.

У Пастанове № 193 аргкамітэта Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР па Віцебскай вобласці ад 2 сакавіка 1939 года "Аб стане бібліятэчнай справы па Віцебскай вобласці" адзначана: "Прыкладам добрай работы могуць служыць Аршанскі, Віцебскі Дом кнігі, Сенненская раённая бібліятэка, арганізуючыя лекцыі, даклады, выставы". (Віцебскі Дзяржархіў, ф.1966 ).

**1941-1944 г.г.** У час Вялікай Айчыннай вайны кніжны фонд быў поўнасцю разграблены фашыстамі. У 1944 годзе бібліятэка зноў пачала працаваць. Вялікую арганізатарскую работу па збору кніг правяла загадчыца Есьмен Зінаіда Пятроўна. Ва ўзнаўленні кніжнага фонду бібліятэкі прынялі ўдзел бібліятэкі Кастрамы, якія прыслалі 560 экз. кніг, у асноўным галіновых.

**1991- 1992 г.г.** – бібліятэка знаходзілася ў будынках аддзела статыстыкі і дзіцячай бібліятэкі.

**1993 г.**
Для цэнтральнай раённай бібліятэкі выдзелены асобны будынак былога гарсавета, у якім яна знаходзіцца і зараз.



## *Асноўныя паказчыкі работы 1946 - 2010 г. г.*

| ГАДЫ | 1946 | 1950 | 1960 | 1970 | 1980 | 1990 | 2000 | 2010 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ЧЫТАЧЫ | 799 | 1592 | 2655 | 3510 | 3560 | 3040 | 3153 | 3367 |
| КНІГАВЫДАЧА | 3180 | 24967 | 40264 | 52300 | 76800 | 62421 | 68767 | 65399 |

*Библиотека…Тишина… Столетья…*
*История и тысячи имён!*
*Благословляем вас на долголетье –*
*Всех тех, кто в труд прекрасный свой*
*влюблён.*

*Профессия стара, как мир и время,*
*От первых свитков до больших томов*
*Вы любите и бережёте верно*
*Пылинки времени и заповедь веков.*

*Даёте вы не книги под расписку…*
*Вы людям дарите великий мир*
*И в детских душах нераскрытых,*
*чистых*
*Рождается божественный кумир*

*Здесь мысли, чувства, тайны, мудрость века.*
*Пусть дуют в мире ветры перемен,*
*Храни свой ценный клад, библиотека!*
*Пусть не коснутся книг забвение и тлен*



# *Спіс работнікаў Сенненскай раённай бібліятэкі з 1919 па 2012 г.г.*

| № | прозвішча, імя, імя по бацьку | пасада | час працы | адукацыя |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Ліфшыц Р.С. | заг. бібліятэкай | 1918-1923 | сярэдняя |
| 2 | Старыковіч І. | заг. бібліятэкай | 1924-1926 | пачатковая |
| 3 | Савіна І. | бібліятэкар | 1924 | 3 класы |
| 4 | Стацік В. | заг. бібліятэкай | 1926 | пачатковая |
| 5 | Данілаў П. | заг. бібліятэкай | 1926(люты) | 2 класы |
| 6 | Мацвееў | заг. бібліятэкай | 1926 (чэрвень) | 2 класы |
| 7 | Белякоў | заг. бібліятэкай | 1926 (ліпень) | 2 класы |
| 8 | Долман | заг. бібліятэкай | 1927-1929 | н/сярэдняя |
| 9 | Кузьміцкая Н.І. | бібліятэкар | 1927 | пачатковая |
| 10 | Лучаноўская І.С. | бібліятэкар | 1921-1931 | н/сярэдняя |
| 11 | Міклушоў | заг. нардомам | 1929 | н/сярэдняя |
| 12 | Есьмен З.П. | заг. бібліятэкай | 1944-1946 | сярэдняя |
| 13 | Дашкевіч Р.Д. | бібліятэкар | 1946 | н/сярэдняя |
| 14 | Камандышка З. | заг. бібліятэкай | 1946-1948 | н/сярэдняя |
| 15 | Гарнакова Ізабэлла Канстанцінаўна | бібліятэкар | 1946-1950, 1977-... | сярэдняя |
| 16 | Хомчанка А. | заг. бібліятэкай | 1948-1950 | н/сярэдняя |
| 17 | Кукшынава Анастасія Дзмітрыеўна | заг. бібліятэкай | 1974-1977, 1977 - 2006 | сяр. спец. |
| 18 | Стэльмахова Л.А. | бібліятэкар | 1950-1952 | сяр. спец. |
| 19 | Маскалёва В.В. | бібліятэкар | 1952-1953 | сярэдняя |
| 20 | Разум В.А. | заг. перасоўн. фондам | 1952-1953 | сярэдняя |
| 21 | Курс В.Б. | заг. перасоўн. фондам | 1953-1958 | н/сярэдняя |
| 22 | Міраповіч Любоў Ігнатаўна | заг. чытальнай залай | 1953-1955, 1958-1978 | вышэйшая |
| 23 | Колмак А.А. | бібліятэкар | 1955-1967 | сяр. спец. |
| 24 | Шашылава А.К. | заг. перасоўн. фондам | 1957-1976 | сяр. спец. |
| 25 | Кішыцэр Т.Д. | бібліятэкар | 1971-1972 | сярэдняя |
| 26 | Крывялёва Галіна Міхайлаўна | бібліятэкар | 1967-1971 | сяр. спец. |
| 27 | Прыстаўка Тамара Пятроўна | бібліятэкар | 1973-1976 | вышэйшая |
| 28 | Пальянава (Кучко) Галіна Пятроўна | заг. абанементам, заг. аддз. абслуг. | 1973-2008 | сяр. спец. |
| 29 | Платонава Тамара Барысаўна | заг. бібліятэкай | 1972-1974 | вышэйшая |
| 30 | Чарнышова Вольга Мікалаеўна | заг. абанементам | 1972-1975 | сяр. спец. |
| 31 | Зязюліна Рэгіна Казіміраўна | заг. бібліятэкай | 1982 - 1983 | вышэйшая |
| 32 | Раманоўская М.А. | бібліятэкар | 1972-1973 | сяр.спец. |
| 33 | Паляшчук Ніна Рыгораўна | гал. метадыст, дырэктар ЦБС | 1976- 2014 | вышэйшая |
| 34 | Зюзькова Ніна Данілаўна | метадыст | 2003-2012 | вышэйшая |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 35 | Пудава Валянціна Уладзіміраўна | заг. чытальнай залы | 1976-1979 | вышэйшая |
| 36 | Зайко Таццяна Пятроўна | бібліятэкар | 1976-1977 | сяр. спец. |
| 37 | Сапроненка Тамара Іванаўна | заг. аддзела камплектавання | 1977-1995 | сяр.спец. |
| 38 | Шаўлюк Надзея Іванаўна | дырэктар ЦБС | 1978-1982 | вышэйшая |
| 39 | Кузняцова Кацярына Уладзіміраўна | заг чытальнай залай | 1978-1982 | сяр.спец. |
| 40 | Касушкіна Надзея Міхайлаўна | бібл. аддзела камплект. | 1976-1980 | сяр. спец. |
| 41 | Дзедунова Яўгенія Паўлаўна | бібл. аддзела камплект. | 1977-2004 | сяр. спец. |
| 42 | Лындзіна Наталля Мікалаеўна | бібл. аддзела камплект. | 1978-1985 | сяр. спец. |
| 43 | Цярэнцьева Валянціна Тарасаўна | бібліятэкар аддзела абслуг. | 1977-1980 | сяр. спец. |
| 44 | Шарэнда Васілій Кірылавіч | бібл. аддзела камплект. | 1977-1996 | сяр. спец. |
| 45 | Маісеева Тамара Сцяпанаўна | бібл.аддзела абслуг. | 1976-1977 | сярэдняя |
| 46 | Блажэвіч Марына Браніслаўна | бібліятэкар | 1977-1978 | сяр. спец |
| 47 | Маліноўская Галіна Аляксандраўна | бібл. аддзела камплект. | 1977-1978 | сяр. спец |
| 48 | Вышынская (Гардзюк) Алена Людзвігаўна | галоўны бібліятэкар | 1979- | вышэйшая |
| 49 | Мандрык Соф'я Мікалаеўна | заг. аддзела кампл. | 1995-... | вышэйшая |
| 50 | Пабядзінская Ларыса Герасімаўна | бібліятэкар | 1980-1993 | сяр. спец. |
| 51 | Кулік Любоў Фёдараўна | гал . бібліёграф | 1982-2011 | сяр. спец |
| 52 | Шубка (Семянкова) Людміла Генадзеўна | гал. бібліятэкар | 1977 | сяр. спец. |
| 53 | Гарбачова Таццяна Рыгораўна | метадыст | 1986-2003 | вышэйшая |
| 54 | Штанцова Ала Міхайлаўна | бібліятэкар аддзела абслуг. | 1986-1996 | вышэйшая |
| 55 | Валадзько Ірына Анатолеўна | бібліятэкар аддзела абслуг. | 1988-1989 | вышэйшая |
| 56 | Ісачанка Наталля Валянцінаўна | мастак- афарміцель | 1989-... | сярэдняя |
| 57 | Дземчанка Валянціна Васілеўна | заг. матэрыяльна- тэхнічнага аддзела | 1990-2002 | сярэдняя |
| 58 | Красноўская Таццяна Мікалаеўна | заг. аддзела маркетынга | 1997-... | вышэйшая |
| 59 | Кавалеўская Ларыса Алегаўна | бібліятэкар аддзела абслуг. | 1993-2007 | вышэйшая |
| 60 | Кеніх Таццяна Аляксандраўна | бібліятэкар аддзела абслуг. | 1997-1998 | сярэдняя |
| 61 | Догіль Кацярына Віктараўна | метадыст 1 к. аддзела маркетынга | 2000-... | вышэйшая |
| 62 | Мяснікава Вольга Аляксандраўна | бібл. аддзела камплект. | 2001-... | вышэйшая |
| 63 | Кулік Лілія Сяргееўна | заг. аддзела абслуг. | 2001- | вышэйшая |
| 64 | Марціновіч Марына Анатолеўна | бібл. аддзела камплект. | 2004-.2012 | вышэйшая |
| 65 | Бубянкоў Сяргей Віктаравіч | інжынер | 2007-2009 | вышэйшая |
| 66 | Кашпар Іна Аляксандраўна | бібл. аддзела абслуг. | 2006-... | сяр. спец. |
| 67 | Кучынская Вольга Мікалаеўна | бібл. аддзела абслуг. | 2007-... | сяр. спец. |
| 68 | Мяцеліца Галіна Мікалаеўна | бібл. аддзела абслуг. | 2008-2014 | сяр. спец. |
| 69 | Фядзюк Ігар Якаўлевіч | інжынер | 2009-2013 | вышэйшая |
| 70 | Пракаповіч Вольга Дзмітрыеўна | бібліёграф | 2010-... | вышэйшая |
| 71 | Гарнак Ніна Аляксандраўна бібл. аддзела абслуг. | бібл. аддзела абслуг | 2010-... | вышэйшая |

## *Бібліятэка – выток розуму і дабра*

З першых дзён перамогі Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі партыя і ўлада праяўлялі заботу аб павышэнні палітычнай граматнасці агульнага культурнага ўзроўню, тэхнічных і агранамічных ведаў насельніцтва. Бібліятэка знаёміла чытачоў з Пастановамі партыі і ўлады праз кніжныя выставы, гучныя чытанні, гутаркі, вечары, дыспуты. Асноўная ўвага надавалася прапагандзе твораў Леніна і літаратуры аб ім. Праводзілася вялікая работа па камуністычнаму выхаванню моладзі. У практыку работы ўвайшлі вечары сустрэч. У 1962 годзе на вечар былі запрошаны беларускія пісьменнікі Н.Гілевіч, А.Вялюгін. М.Бялевіч і М.Калачынскі. Бібліятэка часта праводзіла вечары-сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі, вайны і працы.

У 1964 годзе ўпершыню прымяніла новую форму масавай прапаганды кнігі - завочную чытацкую канферэнцыю “Малады герой савецкай літаратуры”, якая была арганізавана на старонках мясцовай газеты “Ленінская іскра”.

Удзялялася вялікая ўвага прапагандзе сельскагаспадарчай літаратуры. Да сельскагаспадарчых нарад рыхтаваліся адкрытыя прагляды літаратуры і кніжныя выставы.




***Кніжная выстава, прысвечаная савецкаму ладу жыцця***

Клуб любіцелей кнігі “Рамантык” быў створаны ў 1968 годзе пры бібліятэцы сумесна з РДК і райкамам камсамола. Каб прыблізіць кнігу да месца жыхарства і месца працы, ад бібліятэкі было арганізавана 30 бібліятэк-перасовак. Актыўней стала весціся прапаганда грамадска-палітычнай літаратуры. Калі ў 1946 годзе бібліятэка выдала сваім чытачам 147 экз. палітычнай літаратуры, то ў 1967 годзе – 7967 экз.



*Кніжная выстава, прысвечаная 50-годдзю БССР і КПБ*

Ва ўсе часы кніга была і застаецца важнай крыніцай пазнання свету, адным з лепшых сродкаў выхавання чалавека. Бібліятэка працуе ў самых розных накірунках-выхаванне патрыятызму, маральна- прававой і экалагічнай культуры, абуджэнне цікавасці да гісторыі, мастацтва, прапаганда здаровага ладу жыцця.

Краязнаўства-дзівосная скарбонка самабытнасці, непаўторная, невычарпальная, адметная. Духоўная культура ўвабрала мудрасць, вопыт і традыцыі нашых продкаў, беражліва перадавалася з пакалення ў пакаленне.

Усе наведвальнікі захапляюцца неардынарным інтэр'ерам раённай бібліятэкі. Тут шмат вырабаў з саломкі і іншых прыродных матэрыялаў. Асаблівы нацыянальны каларыт прыдаюць карціны (64) Бандарэвіча В.В. - знакамітага нашага краязнаўцы, мастака. З густам афармляюцца актуальныя кніжныя выставы.

Шырока адзначаўся 70-гадовы юбілей бібліятэкі, на які былі запрошаны былыя бібліятэкары і лепшыя чыта



***Калектыў раённай і дзіцячай бібліятэк з гасцямі на 70-годдзі бібліятэкі (1988 г.)***



***Бібліятэцы – 80 гадоў***



***Бібліятэкары ЦРБ (2007 год) злева направа: Мандрык С. М., Пятрова В.А., Семянкова Л.Г., Зюзькова Н.Д., Кулік Л.Ф., Красноўская Т.М., Паляшчук Н. Р., Гардзюк А.Л., Бубянкоў С.В., Кучко Г.П., Кулік Л.С.***

Поспех любога калектыва пачынаецца з пасняховага кіраўніка, які ўмее ўбачыць новае і перадавое, выдзеліць галоўную задачу на дадзены момант і накіраваць сілы і рэсурсы калектыва на яе рашэнні.

У розныя гады Сенненскую раённую бібліятэку ўзначальвалі: Камандышка Зінаіда (1946-1948), Хомчанка Ганна (1948 – 1950), Платонава

Тамара Барысаўна (1972 – 1974), Кукшынава Анастасія Дзмітрыеўна ( 1974 – 1977), Шаўлюк Надзея Іванаўна (1978 – 1982), Зязюліна Рэгіна Казіміраўна (1982 – 1983).

## Паляшчук Ніна Рыгораўна – дырэктар Сенненскай ЦБС

На пасадзе дырэктара Ніна Рыгораўна Паляшчук працуе з 1983 года. Яна высокакваліфікаваны спецыяліст, добра ведаючы працэсы бібліятэчнай справы.



*Дырэктар ЦБС Паляшчук Н. Р.*

Ёй уласцівы актыўнасць і адказнасць, яна мае здольнасць аналізаваць стан бібліятэк сістэмы, аператыўна планаваць, арганізоўваць , каардынаваць работу. Укараняе ў практыку работы інавацыйныя працэсы. Сенненская ЦБС адной з першай стала выконваць платныя паслугі (1997 г.).




Ніна Рыгораўна пастаянна займаецца пытаннямі ўмацавання матэрыяльна – тэхнічнай базы, стварэння адпаведнага інтэр’ера ў бібліятэках сістэмы. Карыстаецца заслужаным аўтарытэтам сярод работнікаў культуры і сваіх калег.

Па выніках работы Сенненская ЦБС неаднаразова займала першыя месцы ў вобласці. Дырэктар ўзнагароджвалася граматамі ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, Сенненскага райвыканкама і аддзела культуры. Двойчы была занесена на раённую Дошку гонара.

Прафесія бібліятэкара трымаецца на паўсядзённай крапатлівай рабоце. Аддзел абслугоўвання і інфармацыі – самы галоўны аддзел, які непасрэдна працуе з чытачом. Добразычлівасць, уважлівасць, тактычнасць, творчы падыход – гэта не поўны пералік як прафесійных, так і чалавечых якасцей работнікаў гэтага аддзела. Сёння бібліятэкар павінен не проста абслужыць чытача кнігай, але і ў дасканаласці валодаць камп'ютэрам. Сенненская ЦРБ адна з першых у вобласці перайшла на абслугоўванне чытачоў у аўтаматызаваным рэжыме. Бібліятэкар павінен добра арыентавацца ў сферы эканомікі, філасофіі, псіхалогіі, паліталогіі і інш., каб як мага лепей задаволіць запыты чытача, на добрым узроўні правесці масавае мерапрыемства, арганізаваць паседжанне любіцельскага аб'яднання.



***Бібліятэкар Гардзюк А. Л.***



***Бібліятэкар Мяцеліца Г. М.***



***Бібліёграф Пракаповіч В.Д.***



***Бібліятэкар Кучынская В. М.***



*Загадчыцца аддзела абслугоўвання Кулік Л.С.*



*Бібліятэкар Гарнак Н.А.*

У 2004 годзе Сенненскай цэнтральнай раённай бібліятэцы ў намінацыі “Лепшая раённая бібліятэка” прысуджана першая прэмія за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва.

Усіх закаханых у сапраўдную літаратуру аб’ядноўвае літаратурна-эстэтычна клуб “Наедине”.
Кожная сустрэча ўзбагачае новымі ведамі, выхоўвае любоў да прыгожага і цудоўнага.



*Удзельнікі клуба “Наедине”*



Больш за 20 год пры Сенненскай ЦРБ працуе краязнаўчы клуб “Спадчына”, дэвізам якога з’яўляюцца словы: “З глыбінь жыватворных святую вадзіцу мы п’ём і не можам напіцца”. Да 125-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа (2007 год) бібліятэкай у раённым Доме культуры была арганізавана літаратурна-тэатралізаваная вечарына “Нязгасная зорка Купалы і Коласа”. Супрацоўнікі запрасілі гледачоў у незвычайнае падарожжа па купалаўскіх і коласаўскіх шляхах. Гучалі паэтычныя творы, былі прадэманстраваны музычныя і харэаграфічныя кампазіцыі “Спадчына” і “Купалінка”, а закончылася свята тэатральнай пастаноўкай “Паўлінка”.



***Красноўская Т. М., Паляшчук Н. Р., Кулік Л. С., Гардзюк А. Л.***

“Мудрасць здаровага ладу жыцця” – праграма, па якой працуе ЦРБ з 2008 года. Для чытачоў арганізоўваюцца сустрэчы з урачамі, круглыя сталы, гутаркі – разважанні, дыялогі-спрэчкі, выставы-напаміны, часы папярэджання.

На раённым свяце, прысвечаным 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў бібліятэкары ЦРБ і ДРБ прынялі актыўны ўдзел у тэатралізаваным шэсці “Мірнае пасляваеннае жыццё”.



***Тэатралізаванае шэсце “Мірнае пасляваеннае жыццё”(2009 год)***

Да 65-годдзя Вялікай Перамогі (2010 год) калектывам была падрыхтавана імправізаваная тэатралізаваная пляцоўка “У привала”.



***Пляцоўка “У привала”***

Да Дня незалежнасці і да 130-годдзя гарадскога пасёлка Багушэўск у гэтым жа годзе была падрыхтавана тэатралізаваная пляцоўка “Продолжая традиции прошлого”.

У конкурснай праграме “Заботливая, нежная бабушка моя” (2010 г.) прынялі ўдзел бабулі-бібліятэкары. Да гэтага свята быў прадстаўлены таксама слайд–фільм “Бабушки и их внуки”.



***Удзельнікі конкурснай праграмы “Заботливая, нежная бабушка моя”***

*Мудрость мира собрав по крупицам живым,*
*Пронести этот дар по дорогам людским,*
*Приумножить его, оживить своим сердцем,*
*Передать поколениям выпало им…*

Вядучы і адказны аддзел бібліятэкі – **аддзел маркетынгу і рэкламы**. Які займаецца пошукам новых напрамкаў дзейнасці і паслуг, фарміруе станоўчы імідж бібліятэк, выконвае ролю каардынуючага цэнтра па інфармацыйна-дасугавай і культурна-асветніцкай дзейнасці, рыхтуе яркія захапляльныя мерапрыемствы. Забяспечвае пастаянны рост прафесійнага майстэрства, знаёміць з перадавым вопытам калег на нарадах і семінарах, з аператыўнай і якаснай інфармацыяй аб навінах жыцця вобласці і краіны. Займаецца пашырэннем платных паслуг і ўкараненнем іх у практыку. Мэтанакіравана займаецца рэкламнай дзейнасцю, выпрацоўваючы сістэму ўзаемадзеяння са сродкамі масавай інфармацыі.



*Метадыст 1 катэгорыі Догіль К. В.*



*Загадчыца Красноўская Т.М.*



*Мастак- афарміцель Ісачанка Н.В.*



*Метадыст Зюзькова Н.Д.*

Конкурсы прафесійнага майстэрства, бенефісы, святы бібліятэкара, семінары, нарады, дэкады, тыдні, публікацыі ў газетах і часопісах, выступленні па радыё, рапрацоўка метадычных матэрыялаў і сцэнарыяў, вытворчая вучоба, выезды ў сельскія бібліятэкі з мэтай аказання метадычнай і практычнай дапамогі. Арганізацыяй і правядзеннем усяго гэтага займаецца аддзел бібліятэчнага маркетынгу.



***Конкурс прафесійнага майстэрства “Я – бібліятэкар”***
***(2010 год)***

Сабраць багаты мясцовы краязнаўчы матэрыял дапамаглі аб’яўленыя сярод бібліятэк конкурсы “Радаслоўная роднага краю”, “З крынічак памяці народнай”, “Летапіс бібліятэкі”. Гэтыя альбомы карыстаюцца асаблівай папулярнасцю сярод чытачоў.

У 2011 годзе ў рамках рэспубліканскай акцыі “Никто не забыт” была арганізавана паездка да мамерыяльнага комплекса “Купаваць” на месца гібелі Героя Савецкага Саюза Канстаціна Заслонава і яго баявых таварышаў. На сустрэчу “Страницы памяти священной” запрашаліся людзі, якія мужна змагаліся на франтах, ваявалі ў партызанскіх атрадах, прайшлі праз жахі канцлагераў і блакаднага Ленінграда. Мерапрыемства прысвячалася 70-годдзю з дня пачатка Вялікай Айчыннай вайны.



***Удзельнікі сустрэчы “Страницы памяти священной”***

**Аддзел камплектавання і апрацоўкі літаратуры** пачаў працаваць з дня цэнтралізацыі бібліятэчнай сістэмы – 20 верасня 1977 года. У той час у аддзеле працавала дзевяць чалавек. Узначальвала калектыў Сапроненка Тамара Іванаўна. Асноунымі задачамі і функцыямі аддзела з’яуляюцца: планаванне камплектавання адзінага фонда ЦБС, падпіска на перыядычныя выдані для ўсёй сістэмы, стварэнне каталогаў ЦБС, вядзенне і рэгадаванне цэнтральнага алфавітнага і ўліковага каталогаў, вывучэнне склада і выкарыстанне кніжнага фонду філіялаў, пераразмеркаванне літаратуры, зверка кніжных фондаў згодна перспектыунага плана, спісанне ветхай і састарэлай літаратуры, улік фонда, прыем і передача новых паступленняу літаратуры.

З мэтай кіраўніцтва камплектаваннем адзінага фонда сістэмы аддзел працуе з выдавецтвамі Рэспублікі Беларусь: “Мастацкая літаратура”, “Беларуская энцыклапедыя”, “Вышэйшая школа”, “Харвест”, “Беларуская навука”, з выдавецтвам “Экзархат” і іншымі. Галоуным у працы камплектатара бібліятэк з’яуляецца правільны выбар каштоўнай, змястоўнай літататуры, адпавядаючай патрабаванням чытача.



*Заг. аддзела камплектавання Мандрык С. М.*



*Бібліятэкар Семянкова Л. Г.*



*Бібліятэкар Мяснікава В. А.*



*Бібліятэкар Марціновіч М. А.*

## Сенненская раённая дзіцячая бібліятэка

Дзіцячая бібліятэка дзейнічала як аддзел цэнтральнай з мая 1918 года. На той час фонд дзіцячай літаратуры складаў 1522 экз., абслугоўваўся 451 чытач. Быў створаны дзіцячы савет, які аказваў вялікую дапамогу ў рабоце. У школах арганізоўваліся перасоўкі. З 1936 года бібліятэка была пераведзена ў будынак раённага Дома культуры. За час фашысцка-нямецкай акупацыі фонд быў знішчаны. У 1949 годзе адкрываецца дзіцячая бібліятэка асобна ад дарослай на самастоным бюджэце. Кніжны фонд склаў 2220 экз., чытачоў – 364. Загадвала бібліятэкай Тарасава Галіна. У 1970 годзе бібліятэка атрымала новае

абсталяванне. Новае памяшканне (былы панскі дом, які пабудаваны ў 1915 годзе), бібліятэка атрымала ў 1981 годзе, дзе знаходзіцца і зараз.

Напрамкі дзейнасці дзіцячай бібліятэкі – пошук духоўна-краязнаўчых каранёў, адраджэнне вытокаў народнай культуры, пісьменнасці, роднай мовы, прапаганда маральна - прававых і эстэтычных ведаў. Вялікая ўвага ўдзяляецца прапагандзе бібліятэкі і чытання. Гэтаму садзейнічалі ўрокі культуры чытання, бібліяграфіі, агляды навінак літаратуры, кніжныя выставы.



***Зайко Т. П. праводзіць бібліяграфічны агляд навінак літаратуры***

У 70-ых гадах пры бібліятэцы працаваў клуб аматараў паэзіі “Данка”. Паседжанні арганізоўваліся сумесна з літаратурным аб’яднанненм “Верасы” “Ленінскай іскры” і актывістамі раённага Дома культуры. У 80-ых гадах пры бібліятэцы сталі працаваць клубы “Хачу ўсе ведаць” і “Крывічы”.

Адной з важнейшых задач з самагага пачатку дзейнасці і па сянняшні дзень з’яўляецца патрыятычнае выхаванне. Дзейсны сродак зносін падрастаючага пакалення з жывымі сведкамі вайны – сустрэчы з ветэранамі.




***Сустрэча чытачоў з піянеркай-гераіняй, удзельніцай Вялікай Айчыннай вайны, Багданавай Надзеяй, (1971 г.)***

Штогод праходзяць цыклы ўрокаў мужнасці, вечары салдатскай славы, патрыятычныя чытанні.




*Сустрэча чытачоў з беларускім пісьменнікам Хазанскім В. Я. на канферэнцыі па яго кнізе “Спросите у берез …” (1972 г.)*

Бібліятэка – гэта храм. Храм культуры, храм духоўнасці, дзе ўсё павінна быць у гармоніі: эстэтычны выгляд памяшкання, напаўняльнасць кніжных паліц, духоўны стан супрацоўнікаў. І тым больш у дзіцячай бібліятэцы, куды маленькі чытач павінен ісці з радасцю, адчуваць сябе тут камфортна, утульна і вольна. Чытаючае дзіця – надзея і будучае нашай краіны, так як праз колькі год, ад гэтага дзіця будзе залежыць, якое месца і якую ролю кніга займе ці не займе ў грамадстве.



***Школьнікі з задавальннем наведваюць бібліятэку***

Не ведаць свайго мінулага – не мець будучыні. Любіць свой край як часцінку Бацькаўшчыны вучаць бібліятэкары чытачоў на краязнаўчых уроках, гадзінах даўніны і сучаснасці, падарожжах па творах краязнаўцы і мастака В.Бандарэвіча.

Зюзькова Ніна Данілаўна ўзначальвала Сенненскую раённую дзіцячую бібліятэку з 1982 па 2003 год. На пасадзе метадыста аддзела бібліятэчнага маркетынгу працавала з 2003 па 2012 год. Узнагароджвалася неаднаразова граматамі ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама і аддзела культуры Сенненскага райвыканкама. Ёй было прысвоена званне “ Жанчына года – 99” у намінацыі “Жанчына ў сістэме культуры”



***Загадчыца бібліятэкі Зюзькова Ніна Данілаўна***

У 1996 годзе створаны лялечны тэатр кнігі “Пятрушка”, які дзейнічае па сённяшні час. Яго ўдзельнікамі з’яўляюцца работнікі цэнтральнай раённай і дзіцячай бібліятэк. Кіруе лялечным тэатрам кнігі Цярэнцьева Валянціна Тарасаўна.

Сустрэча з добрай кнігай, добрай казкай – заўсёды свята, і свята ўдвая, калі сустракаецца маленькі чытач з казачнымі героямі-лялькамі на тэатралізаваных мерапрыемствах і спектаклях лялечнага тэатра кнігі “Пятрушка”.



***Удзельнікі лялечнага тэатра “Пятрушка”***

Кожны год Сенненская дзіцячая раённая бібліятэка да Дня інвалідаў прадстаўляе прэм’еру спектакля. Тэатр кнігі “Пятрушка” – часты госць у сацыяльна - педагагічным цэнтры, садках, школах раёна, сельскіх клубах. Вялікай узнагародай для калектыва стаў дыплом “За лепшае ваджэнне

лялек” на першым абласным свяце лялечных тэатраў “Запрашаем у казку”, якое адбылося ў г. Дуброўна. У 2011 годзе тэатру прысвоена званне “Народны”.

Ужо больш дзесяці год бібліятэка працуе па праграме “Міласэрнасць” (рэбілітацыі дзяцей - інвалідаў і арганізацыі іх вольнага часу). Якая ў 2001 годзе была адобрана Прэзідэнтам і ўдастоена яго Гранда. У рамках праграмы арганізуцца акцыі міласэрнасці, забаўляльна – пазнавальныя конкурсы, набываюцца падарункі для дзяцей-інвалідаў.



*Читатель, друг из самых лучших*
*Из всех попутчиков попутчик.*
*Из всех своих особо свой*
*Всё слушать мастер дивный*
*Неприхотливый. Безунывный*.



***Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі “Цуд – імя якому кніга”***

Галоўнай падзеяй вясновых канікулаў стала правядзенне Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі. Дзеці з задавальненнем прымаюць ўдзел ў тэатралізаваных святах кнігі, захапляльна-гульнёвых конкурсах, віктарынах, літаратурных круізах. Традыцыйна завяршаецца Тыдзень конкурсам “Суперчытач года”.



***“Цягнічок – сюрпрыз” разам са сваімі лепшымі чытачамі***

У рабоце па фарміраванню здаровага ладу жыцця бібліятэка дзейнічае не адна, а ў кантакце з медыцынскімі ўстановамі, камітэтам па справах непаўналетніх, камітэтам па справах моладзі.

У бібліятэцы аформлена кніжная выстава “Азбука здароўя”. Да сусветнага дня прафілактыкі СН1Ду прайшла сустрэча-дыялог з урачом-нарколагам ”Не отнимай у себя завтра“.

Калектыў: Гарбачова Т.Р., Цярэнцьева В.Т., Прачуханава Т.І., Паляшчук В.А. імкнецца рабіць так, каб чытанне заставалася адной з важнейшых сфер духоўнай дзейнасці дзяцей і адным з галоўных спосабаў правядзення дасуга.



*Мастак Ісачанка Н. В,. бібліятэкар Паляшчук В.А, заг. дзіцячай бібліятэкі Гарбачова Т.Р., бібліятэкар Прачуханава Т.І., заг. аддзела камплектавання Мандрык С. М. і бібліятэкар Цярэнцева В.Т*

У 2007 годзе бібліятэка пачала працаваць па праграме “Дарога да Храма”. Асноўнай яе задачай і прыярытэтным напрамкам з’яўляюцца пытанні духоўнага адраджэння, прапаганда і вывучэнне праваслаунай літаратуры, бо даўно вядома, што толькі развіццё маральнасці, духоўнасці, узнаўленне хрысціянскай культуры магчыма выхаванне высокадухоўнай асобы. Праходзяць штомесячныя ўрокі праваслаўя, сустрэчы са святаром, духоўныя гутаркі.

У 2009 г. Сенненскай дзіцячай раённай бібліятэцы–філіялу №1 была прысуджанна прэмія за высокія, творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацва ў намінацыі “Лепшая дзіцячая бібліятэка”. Раённая дзіцячая бібліятэка за 2010 год абслужыла 2200 чытачоў, да паслуг якіх прадстаўлены кніжны фонд 22610 экзэмпляраў і каля 30 – найменняў газет і часопісаў. За гэты год выдадзена 45039 бібліятэчных дакументаў.

# Багушэўская гарпасялковая бібліятэка




***Будынак бібліятэкі***

Бібліятэка з’яўляецца інфармацыйна-культурнай установай, дапамагае ў вучобе, у арганізацыі вольнага часу, з’яўляецца месцам для прыемных і карысных сустрэч. Бібліятэка – гэта, вобразна кажучы, святы храм, дзе жывуць цеплыня, добразычлівасць, ветлівасць і шмат чаго іншага. Калі не будзе гэтага, значыць, ніколі не зазірнуць сюды цікавыя, неардынарныя людзі.У 1839 годзе на месцы цяперашняга г.п.Багушэўск з’явіліся першыя пасяленцы. І толькі у пачатку XX стагоддзя – хата - чытальня пры клубе чыгуначна-дарожнай станцыі. У 1931 годзе пачаў працаваць Нардом, пры ім была адчынена бібліятэка. У час Вялікай Айчыннай вайны бібліятэка згарэла. І толькі ў 1946 годзе ў Башушэуску пачала работу раённая бібліятэка. Знаходзілася яна ў прыватным доме на в. Вакзальнай.

Кніжны фонд быў менш за тысячу экз. У бібліятэцы працавала два бібліятэкары. Загадчыцай была Краева Аляксандра Фёдараўна. У 1947 годзе ўзначаліла бібліятэку Куксёнак Лідзія Навумаўна. Адпрацавала яна загадчыцай амаль дваццаць гадоў. Лідзія Навумаўна – гэта чалавек, які ў жыцці робіць тое, што ўмее рабіць па-сапраўднаму. Яна была неабыякавай да бібліятэчнай справы, бо не была абыякавай да людзей. Любоў да чалавека – галоўная рыса яе характару.



***Загадчыца Багушэўскай дзіцячай бібліятэкі Казлова К .П.***

У 1951 годзе было пабудавана памяшканне для бібліятэкі. Дзіцячы аддзел быў рэарганізаваны ў гарпасялковую дзіцячую бібліятэку.

38 год была нязменным рулявым Багушэўскай гарпасялковай дзіцячай бібліятэкі Клаўдзія Пятроўна Казлова (Уткіна). Папрацаваўшы на гэтай пасадзе ўсяго год яна атрымала наступную характарыстыку: “За год работы товарищ Козлова вывела детскую библиотеку в одну из лучших библиотек области, организовала открытый доступ к книжному фонду, оказывала методическую и практическую помощь школьныи и сельским библиотекам, организовывала интересную и содержательную работу”.











***Бібліятэкары Быкава Т. М., Н. Ф.Зайцава Н. Л., Лагунова В. К., Шляхта Г.***

Гісторыя бібліятэкі – гэта яе людзі, якія беражліва падтрымлівалі лепшыя традыцыі ўстановы. Добрымі дарадчыкамі, настаўнікамі і сябрамі чытачоў у розныя гады былі: Беленькая, Краева А.Ф., Куксёнак Л.Н., Рудак В., Істужкіна Н.Ф., Купрыянава З.М., Драздова В.М., Луцейковіч В.М., Быкава В.І., Лагунова В.К., Казлова К.П., Зайцава Н.Л., Сошнева Н.Ф., Кузняцова А.В., Шумарова Г.І., Ярашэнка Л.Б., Рацькова Н.П., Цвяткоў Г.С., Яфрэмаў Н.А., Шэдчанка С., Гаўрылава Т.М., Габрынец Т.Ф., Шолахава А.В., Цуран Ж.Я., Зязюліна Г.А., Мыслівец В.М., Яфрэмава Б.А., Шляхта Г. і інш.



***Бібліятэкар Гаўрылава Т. Н.***

1960 годзе Багушэўскі раён увайшоў у склад Сенненскага раёна. Багушэўская раённая бібліятэка была рэарганізавана ў гарпасялковую. Працавала ў ёй у той час 2 бібліятэкары.

У 1970 годзе бібліятэка абслугоўвала 2500 чытачоў. Кнігавыдача складала 60000 экз. З гэтага ж года стала працаваць чытальная зала. Уведзена стаўка бібліятэкара. Першым загадчыкам чытальнай залы быў Цвяткоў Г.С., потым яго змяніў Яфрэмаў Н.А., які потым стаў працаваць рэдактарам маскоўскага часопіса “Досье на цензуру”. Ён таксама напісаў кнігу “Оставь надежду или душу…”, якую падарыў бібліятэцы.

У 1977 годзе праведзена цэнтралізацыя бібліятэк. Багушэўская бібліятэка стала філіялам № 2 Сенненскай ЦБС.

Заўсёды бібліятэка з’яўлялася прапагандыстам новых ідэй і кніг, арганізатарам і ўдзельнікам культурных мерапрыемстваў пасёлка.

Цікава і змястоўна тут праходзяць тэматычныя і літаратурныя вечары, прэзентацыі кніг, віктарыны, сустрэчы са знакамітымі людзьмі, КВЗ, чытацкія канферэнцыі, вусныя часопісы.



***Канферэнцыя па кнізе В. Т.Рыжыкава і Прахарэнка “Грозно шумела пуща”***

Адным з асноўных напрамкаў дзейнасці з’яўляецца краязнаўства. Аформлены краязнаўчы куток “Радаслоўная роднага краю”. Вялікая пошукавая работа вядзецца па папаўненню летапісаў Багушэўска. Добрым дапаўненнем да краязнаўчага фонду служаць альбомы і папкі “Вяртанне ў спадчыну”, “Гістарычнае мінулае нашага раёна”, “Паром памяці праз раку часу”, “Роднымі сцежкамі”, “Край велічы і хараства” і інш.




***Краязнаўчы куток***

У 2005 годзе бібліятэка стала пераможцай абласнога тура XII рэспубліканскага конкурса “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”.

На высокім узроўні у 2003 годзе ў Багушэўская бібліятэцы прайшоў выязны тэматычны семінар “Бібліятэка і моладзь: пошук эфектыўных формаў работы”. Работнікі бібліятэкі прадэманстравалі краязнаўча-літаратурную гадзіну “Судьбы крутая лестница”, якая была прысвечана знакамітым землякам.



***Удзельнікі семінара***




***Лысянкова Л.У., Габрынец Т.Ф., Цуран Ж.Я., Драздова Л.Ф., Шумарова Г.І., Мыслівец В.М.***

У 2008 годзе Багушэўская дзіцячая бібліятэка была аб’яднана з гарпасялковай бібліятэкай (рашэнне Сенненскага райвыканкама №70 ад 29 студзеня 2008 года). У маі гэтага ж года бібліятэка атрымала новае памяшканне (другі паверх пошты), дзе самі бібліятэкары зрабілі бягучы рамонт. Бібліятэка стала ўтульнай і набыла прывабны выгляд.

42 гады аддадзена бібліятэчнай справе Шумаровай Галінай Іванаўнай, 29 з якіх яна з’яўлялася загадчыцай Багушэўскай гарпасялковай бібліятэкай. Гэта высокапрафесійны спецыяліст, граматны, эрудыраваны работнік. Яна ўмела правільна каардынаваць работу бібліятэкі. Карысталася заслужаным аўтарытэтам сярод жыхароў гарадскога пасёлка, калег па рабоце і кіраўніцтва.

Зараз у бібліятэцы функцыяніруе два абанементы (для дзяцей і дарослых), чытальная зала. У 2010 годзе бібліятэку наведала 2500 чытачоў. Ім выдадзена 50666 экз. літаратуры. Кніжны фонд бібліятэкі налічвае больш за 40 тыс. дакументаў.



***Шумарова Г. І., Габрынец Т. Ф., Драздова Л. Ф. на свяце***

З мэтай папулярызацыі духоўна-мастацкай спадчыны свайго краю бібліятэка наладзіла творчыя сувязі са школай мастацтваў, агульнаадукацыйнай школай, Домам культуры, прадпрыемствамі і арганізацыямі. Прыкладам можа служыць свята, прысвечанае 130-годдзю з дня заснавання гарадскога пасёлка Багушэўск, у якім бібліятэкары прынялі самы актыўны ўдзел.



***Чытальная зала***

Адметнае месца ў рабоце займае аматарскае аб’яднанне “Сямейная акадэмія”. Гэта аб’яднанне згуртавала сем’і розных

узростаў, якія на працягу многіх гадоў з’яўляюцца лепшымі чытачамі бібліятэкі. Для ўдзельнікаў праходзяць сямейныя святы, літаратурна-пазнавальныя праграмы, конкурсы сямейнай творчасці, агеньчыкі.

***Милые наши библиотекари***
***Душ людских аптекари и лекари.***
***Скромные, простые и сердечные***
***Мудрых книг хранительницы вечные.***

Утульная сельская бібліятэка, ў якой сабраныя вялікія скарбы, належыць усім нам. Усе, што чалавецтва здзейсніла на працягу тысячагоддзяў, усе накопленыя ім веды, вопыт, знаходзяцца на старонках кніг. Кніга зберагае і перадае гэта багацце будучым пакаленням. Без кнігі шмат чаго каштоўнага згінула б назаўсёды .

Бібліятэка – цэнтр культуры, інфармацыі, духоўнага жыцця на вёсцы.

## Алексініцкая сельская бібліятэка

Першая бібліятэка ў вёсцы з’явілася пасля Вялікай Айчыннай вайны. У пачатку 60-х гадоў для бібліятэкі было выдзелена асобнае памяшканне ў драўлянай хаце. З жніўня 1954 года на пасаду бібліятэкара гэтай установы была прызначана выпускніца Мінскага бібліятэчнага тэхнікума Стэльмах Раіса Вячаславаўна, якая працавала тут да снежня 1955 года.



***Бібліятэкар Стэльмах Р. В.***

Потым у Алексініцкай сельскай бібліятэцы працавала Шадуйкіс Зінаіда. Яе змяніла Рабцава Ларыса Васілеўна. Яна ўзначальвала бібліятэку 15 год. Ларыса Васілеўна вельмі любіла сваю працу. Разам з клубам праводзілася цікавая і змястоўная работа. Чытачы з ахвотаю наведвалі бібліятэку, дзе можна было з карысцю правесці свой вольны час. Гэта быў бібліятэкар-энтузіяст сваёй справы.



***Бібліятэкар Рабцава Л. В.***

У 1966 годзе бібліятэка пераведзена ў новы будынак разам з клубам. Размяшчаліся яны на прыгожым узгорку сярод вёскі. У 1979 годзе будынак згарэў і згарэлі амаль усе кнігі. Пад бібліятэку калгас выдзеліў другі будынак, у якім бібліятэка існавала амаль 4 гады. Потым бібліятэка была пераведзена у двухпакаёвую кватэру новага дома.

З 1980 года па 2007 год бібліятэкарам працавала Шэйма Людміла Васільеўна. У 1987 годзе ў Алексінічах быў узведзены новы адміністацыйны будынак, у якім на другім паверсе было выдзелена месца і пад бібліятэку.



***Бібліятэкар Шэйма Л. В.***

Праводзілася шмат цікавых мерапрыемстваў. Некаторыя з іх ладзіліся разам з Румо В.А., бібліятэкарам Леснікоўскай сельскай бібліятэкі.



***Выстава букетаў “Чароўны свет кветак”***
***(у цэнтры бібліятэкар Гарнак М. А.)***



**Мерапрыемства для сталых людзей**

Пасля выхаду Шэйма Л. В. на пенсію, бібліятэку прыняла Азаронак Алена Сяргееўна. На час яе дэкрэтнага водпуску на пасаду бібліятэкара была прызначана Гарнак Марыя Анатолеўна.

## Андрэйчыкаўская сельская бібліятэка

У канцы 40-х пачатку 50-х гг. калгас “Ударнік” арэндуе ў калгасніка П.Васілеўскага палову дома. Там размяшчаецца калгасная бібліятэка, дзе бібліятэкарам працуе Няфёдаў Кірыла Данілавіч. Кніжны фонд бібліятэкі памяшчаўся ў 2-х шафах.

У 1954 годзе пабудавана памяшканне для клуба і бібліятэкі. На пасаду бібліятэкара была прызначана Аўчынка Клаўдзія Аляксандраўна. Кніжны фонд бібліятэкі ў той час налічваў 2000 экз. Паслугамі бібліятэкі карысталіся 400 чытачоў.

Будынак клуба і бібліятэкі ў 1977 годзе згарэў. Часова пад бібліятэку адведзены ленінскі пакой калгаса. У 1979 годзе здадзены ў эксплуатацыю Андрэйчыкаўскі сельскі клуб. Адно з памяшканнеў выдзелена пад бібліятэку.

У сувязі з выхадам на заслужаны адпачынак К.А.Аўчынкі ў 1981 годзе на пасаду бібліятэкара прынята Лындзіна Ала Віктараўна. Фонд бібліятэкі складаў 7730 экз. Біблятэка абслугоўвала больш за 500 чытачоў.



***Бібліятэкар Лындзіна А. В.***

У 1985 годзе Лындзіна А.В. закончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. Работа бібліятэкі актывізавалася. Сталі працаваць гурткі “Жывое слова” і “Вавёрачка”. У 2003 годзе дадзены старт штогодняй экалагічнай акцыі “Деревце в теплых ладонях”. Пачало працу любіцельскае аб’яднанне “Кветкавая вясёлка”.

## Беліцкая сельская бібліятэка

Беліцкая бібліятэка заснавана ў 1928 годзе. У 1929 годзе ў вёсцы арганізаваўся калгас і дзейнічаў ён да 1956 года. У час існавання калгаса ў Старай Беліцы быў пабудваны сельскі клуб, дзе знаходзілася

таксама кінаўстанова і быў выдзелены пакой для кніг. Гэты пакой называўся хатай-чытальняй. Кніжны фонд на той час быў зусім маленькі. Кнігі прыносілі самі жыхары, загадваў Рачкоўскі Аляксандр Раманавіч. Потым працаваў Салтановіч Рыгор Дзмітрыевіч, Сенатараў Аляксандр.

У 1963 годзе ў Беліцкую бібліятэку прыйшла працаваць Прылатава (Луцыковіч) Валянціна Пятроўна. Яна працавала да мая 1998 года.



***Бібліятэкар Прылатава В. П.***

У 1990 годзе Беліцкая бібліятэка была пераведзена ў асобны ад клуба будынак.

На пасадзе бібліятэкара яе змяніла Сінічэнка Валянціна Канстанцінаўна ( май 1998 – жнівень 2007 года) яна адпрацавала ў бібліятэцы да жніўня 2007 года, затым была пераведзена загадчыцай Рулёўшчынскай сельскай бібліятэкі. Валянціна Канстанцінаўна шмат увагі ўдзяляла добраўпарадкаванню будынка, аздабленню знешняга і ўнутранага выгляду. У 2008 годзе за добрасумленныя адносіны да працы яе партрэт быў размешчаны на раённай Дошцы гонару.



***Бібліятэкар Сінічэнка В. К.***

1 жніўня 2007 года бібліятэку ўзначаліла Саўлевіч Тамара Міхайлаўна.Кніжны фонд на 1 студзеня 2008 года складаў 7847 экз. Бібліятэкар працуе ў цеснай сувязі з Беліцкай сярэдняй школай, Рулёўшчынскім клубам і бібліятэкай.

У бібліятэцы актыўна вядзецца прапаганда здаровага ладу жыцця, прававая адукацыя, фарміруецца нацыянальная культура, пачуццё адказнасці за захаванне мінулага.



***На мерапрыемстве ў Беліцкай школе***

У 2010 годзе Беліцкая бібліятэка пераведзена ў будынак былога Сельскага Савета.

## Белаліпская сельская бібліятэка



**Белаліпская сельская бібліятэка**

Белаліпская хата-чытальня пачала працаваць яшчэ ў пачатку 30-х гадоў. Бібліятэкарамі былі энтузіясты, якія выдавалі насельніцтву кнігі

і газеты пасля сваёй асноўнай работы. У гады Вялікай Айчыннай вайны кніжкі былі згублены і аднаўляцца бібліятэка стала ўжо пасля Перамогі. Пра першага бібліятэкара звесткі не захаваліся. Аб размяшчэнні бібліятэкі таксама нічога невядома. Белаліпскі Дом культуры быў пабудаваны ў 1973 годзе, пад бібліятэку ў ім выдзелена тры памяшканні.

Бібліятэкарам у 1973 года былы прызначана Залецкая Раіса Іванаўна. Пакінуўшы пасаду агранома калгаса, яна 15 год працавала бібліятэкарам. Не маючы бібліятэчнай адукацыі Раіса Іванаўна была ўпэўнена, што прафесія бібліятэкара трымаецца на самаадданай і паўсядзённай працы. Яна добра ведала сваіх чытачоў і ўмела прапагандавала кнігу. Цесную сувязь бібліятэкар наладзіла з Домам культуры, Машчонскай сярэдняй школай. Гэта сувязь не знікла і зараз. Людзі ішлі ў бібліятэку за літаратурай, на мерапрыемствы, проста каб адпачыць і правесці свой вольны час з карысцю.



***Свята народнага каляндара на сцэне мясцовага Дома культуры***

З 1988 года бібліятэкарам гэтай установы стала працаваць Шульга Зінаіда Пятроўна. Яна стала добрым прадаўжальнікам Раісы Іванаўны. Перш – наперш Зінаіда Пятроўна азеляніла ўстанову, абнавіла кніжныя выставы, пазнаёмілася з чытачамі. Яна стала праводзіць дыскусіі, інтэлектуальныя гульні, гадзіны паэзіі, часы цікавых паведамленняў, святы народнага каляндара.



***Бібліятэкар Шульга З. П.***

Асаблівую ўвагу Шульга З.П. надавала пошуку духоўных каранёў, адраджэнню вытокаў народнай культуры, роднай мове, прапагандзе фальклору, звычаяў, свят, абрадаў продкаў. У бібліятэцы быў сабраны вялікі этнаграфічны матэрыял, які быў афармлены ў 1994 годзе ў “Сялянскай хатцы”. Гэта работа была ацэнена і Белаліпская сельская бібліятэка заняла другое месца ў рэспубліканскім конкурсе “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”. Вялікую ўвагу Зінаіда Пятроўна надавала рабоце з людзьмі сталага ўзросту. Работа з такой катэгорыяй чытачоў ёй вельмі ўдавалася.



***Дзень сталых людзей***

Пасля заканчэння Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума бібліятэкарам з 2006 года стала працаваць Кашпар Іна Аляксандраўна. Пасля пераводу яе на працу ў Сенненскую раённую бібліятэку,

бібліятэку з кастрычніка гэтага ж года ўзначаліла Духовіч Марына Вячаславаўна. Яна стараецца не згубіць у сваёй рабоце усё тое добрае і цікавае, што было зроблена за гады работы ўстановы.

## Бярозкаўская бібліятэка-клуб




Бярозкаўская сельская бібліятэка была адчынена для чытачоў па рашэнню Сенненскага райвыканкама 1 кастрычніка 1966 года. Яна размяшчалася ў мясцовым клубе. Кніжны фонд быў невялічкі. Штогод на набыццё кніг сродкі выдзяляў калгас. Першым і нязменным яе бібліятэкарам стала Бярозка (Рукаль) Ніна Нікіфараўна. Яна завочна набыла адукацыю бібліятэкара ў Магілёўскім тэхнікуме. Усю сваю мудрасць і прафесійнасць яна аддае людзям. За гэта людзі яе паважаюць.

Рукаль Н.Н. шмат увагі ўдзяляла правядзенню масавай работы. Яна цесна супрацоўнічала са школай і клубам. Да ўсіх дат чырвонага каляндара ладзіліся канцэрты і тэматычныя вечарыны. У 1967 годзе бібліятэка шырока адзначыла 50-гадовы юбілей Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Быў праведзены вечар трох пакаленняў.

У 1971 годзе быў пабудаваны Дом культуры. Пад бібліятэку было выдзелена два пакоі. Бібліятэкар арганізавала работу бібліятэк – перасовак і бібліятэчных пунктаў. Жадаючых дапамагчы прапагандаваць лепшую літаратуру знайшлося нямала. Гэта Шубка Т.А., Насечанка Г.Н., Пагарэльскі У.М., Ляўко В.Р.

Каб ажывіць работу ўстановы Рукаль Н.Н. пры бібліятэцы арганізавала савет. У яго склад ўвайшлі самыя актыўныя чытачы ўстановы: Гарбачова І.І., Бараноўская Т.Ф., Дуранкова К.М., Таранава Т.І.

Да 55- годдзя Вялікай Перамогі на базе Бярозкаўскай бібліятэкі быў арганізаваны выязны тэматычны семінар “Подзвіг вялікі і вечны”, да якога Рукаль Н.Н. сумесна з бібліятэкарам Пустынкаўскай бібліятэкі Гарнак Н.В. падрыхтавалі вечар Памяці “Паклонімся вялікім тым гадам”. Кожны год Ніна Нікіфараўна раз са сваімі чытачамі кветкамі, падарункамі віншуе ветэранаў з Днем Перамогі.



***Віншаванне ветэрана***

У 2002 годзе бібліятэка была ператворана ў бібліятэку - клуб.




***Бібліятэкар Рукаль Н. Н. са сваімі чытачамі***

Бібліятэкар за час работы сабрала каштоўны краязнаўчы матэрыял аб жыхарах сяла “Зямля ганарыцца людзьмі такімі”. Пры ўстанове з 2000 года працуе клуб сталых людзей “Залаты ўзрост”. Цікава і

змястоўна праходзяць тэматычныя і літаратурныя вечары, святы народнага каляндара, вечары - успаміны, пазнавальныя праграмы .
У 2006 годзе пры Бярозкаўскай бібліятэцы- клубе было арганізаванае раённае свята культработнікаў, а таксама ушанаванне работнікаў, якія адпрацавалі на культурнай ніве больш за 40 год.

## Цыпкаўская сельская бібліятэка

Ідэя аб пераносе бібліятэкі з маланаселенай вёскі Забараўе ў вёску Цыпкі належыць Сенненскаму раённаму аддзелу культуры. Такое перамяшчэнне было зроблена ў 1994 годзе.
З гэтага часу і пачалася гісторыя гэтай культурнай установы. Глушанава Лідзія Пятроўна, бібліятэкар Забараўскай бібліятэкі, перадала кніжны фонд і матэрыяльна - тэхнічныя каштоўнасці Грыгор'евай Наталлі Леанідаўне, якая завочна закончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум.



***Бібліятэкар Грыгор'ева Н. Л.***

Наталля Леанідаўна з энтузіазмам узялася за справу. Зрабіла бягучы рамонт, выдзеленага пад бібліятэку памяшкання. З густам афарміла кніжныя выставы. Стала актыўна прапагандаваць літаратуру. Чытачы ішлі сюды адзін за другім. У бібліятэку вабіла дзяцей, дзе для іх праводзіліся літаратурныя гульні, ранішнікі, віктарыны, конкурсы, тэаралізаваныя прадстаўленні. Дзеці сталі з ахвотаю наведваць, створаныя пры бібліятэцы гурткі “Пралеска” і “Чараўнічка”. Гурткоўцы рыхтавалі цікавыя мерапрыемствы, з якімі выступалі перад рознай аўдыторыяй.



***Народнае свята “Купалле”***

У 1999 годзе на базе Цыпкаўскай бібліятэкі-філіяла №16 прайшоў выязны семінар “Вопыт і знаходлівасць у выкарыстанні новых формаў бібліятэчнай работы”. На семінар былі запрошаны не толькі бібліятэкары раёна, але і бібліятэкары вобласці. Тут удзельнікі вучобы атрымалі метадычныя рэкамендацыі і кансультацыі аб неардынарных метадах прапаганды літаратуры.



***Удзельнікі семінара***

Добрай традыцыяй Наталлі Леанідаўны стала правядзенне сямейных свят, вечароў сямейнага адпачынку, блакітных агуньчыкаў, КВЗ, баляў. Да спадобы жыхарам вёскі Цыпкі і суседніх вёсак сталі святы вёскі і сядзібы.

Амаль на ўсе каляндарныя святы ладзіліся мерапрыемствы. Да ўдзелу ў іх прыцягваліся чытачы рознага ўзросту. Святы, сустрэчы,

вечары праходзілі не толькі ў самой бібліятэцы, але і непасрэдна на даму жыхароў вёсак.

За актыўную работу па прапагандзе літаратуры сярод насельніцтва Наталля Леанідаўна ў 2000 годзе была ўзнагароджана Граматай. Неаднаразова яна атрымлівала граматы і па выніках работы. У 2011 годзе працаваць у бібліятэку прыйшла Гардзюк Алена Эдуардаўна.

## Багданаўская сельская бібліятэка

Гісторыя Багданаўскай сельскай бібліятэкі пачынаецца з 1949 года, калі яна знаходзілася ў вёсцы Поўзікі, дзе быў і сельскі савет. У 50- ых гадах бібліятэка пераведзена ў вёску Гарывец і насіла назву Гарывецкая с/ бібліятэка, загадчыцай якой працавала Бяляцкая Майя. Потым тут працавалі Аднарогая Н.С. і Латышава З.П. Пасля таго, як Запруддзе становіцца цэнтрам калгаса “Верны шлях”, бібліятэка пераведзена у гэту вёску. З жніўня 1962 года ў бібліятэцы працуе Казакевіч А.П.. Кароткі час працавалі Самсонава М.М. і Жыгунова Л.П.

З жніўня 1971 года загадчыцай Запрудзеўскай с/ бібліятэкі пачынае працаваць Несцяронак Дзіяна Уладзіміраўна. У 1990 годзе бібліятэка пераведзена на мех. двор у в. Багданава, а ў 1996 г. – у адміністрацыйны будынак ВЭГа.



***Бібліятэкар Несцяронак Д. У.***

Багданаўская бібліятэка абслугоўвае вёскі: Багданава, Запруддзе, Свечы, Гарадзец, Пожанькі, Поўзікі, Лук’янава, Канева, Каралевічы.

У 2008 годзе Багданаву прысвоены статус аграгарадка і пасля рамонту с/ клуба бібліятэка перамяшчаецца ў будынак клуба і загадчыцай назначаецца Комлева Зінаіда Анатолеўна.



***Бібліятэкар Комлева З.А.***

Праводзіцца шмат цікавых разнастайных мерапрыемстваў сумесна з клубам.



***Удзельнікі семінара***

“Кніга – спадарожніца сямейнага выхавання” – пад такой назвай у 2011 годзе прайшоў семінар у Багданаўскай бібліятэцы. Комлева З. А. падрыхтавала гасцёўню “Мая сям’я – мая радасць”.



***Конкурсная праграма “Яблачны спас”***

## Застадольская бібліятэка - клуб

Застадольская сельская бібліятэка стала працаваць адразу ж пасля вайны, у лютым 1946 года. Яна мела статут – хата - чытальня. Першым

бібліятэкарам быў абраны Шарапаў Уладзімір Філіпавіч. Бібліятэка размяшчалася разам з саветам і клубам. Пад установу было выдзелена маленькае памяшканне. Фонд бібліятэкі складаў толькі 32 экзэмпляры. Чытачамі былі 20 чалавек. Самым першым чытачом бібліятэкі стаў старшыня савета Лагуноў Леанід Іванавіч.



***Ізба-чытальня***

У 1950 годзе на пасаду бібліятэкара была прызначана Пучкова Галіна Іванаўна. Яна працавала да 1954 года. Потым была пераведзена на пасаду загадчыцы Бялькоўскага клуба, адначасова з'яўлялася бібліятэкарам перасоўкі. А бібліятэкарам Застадольскай бібліятэкі стала працаваць Рыпінская Зінаіда Іванаўна. Кніжны фонд на той час ужо складаў 1800 экз. З 1963 года хата - чытальня была пераіменавана ў Застадольскі сельскі клуб. Тут з сакавіка 1967 года працуе Лапаткова Валянціна Мартынаўна. Для бібліятэкі было выдзелена асобнае дабротнае памяшканне.

Бібліятэчны фонд складаў 4500 экз. Чытачоў было 380. У 1977 годзе бібліятэка ўвайшла ў цэнтралізаваную бібліятэчную сістэму як Застадольская бібліятэка - філіял №20.

У 1978 годзе бібліятэку прыняла Ткачова Лідзія Гаўрылаўна.

Яна была энтузіястам бібліятэчнай работы. Умела прапаган-давала лепшую літаратуру. Ладзіла добрыя мерапрыемствы. Да ўдзелу ў іх прыцягвала самых актыўных чытачоў.

З 1985 года на пасадзе бібліятэкара працавала Голяс Таццяна Іванаўна. Бібліятэку наведвала больш за 400 чытачоў. Вялікая колькасць з іх складалі дзеці і падлеткі. Праз год на пасадзе бібліятэкара Голяс Т.І. змяніла Марчанка Таццяна Міхайлаўна. Яна працавала 8 гадоў.

У 1994 годзе бібліятэку ўзначаліла Шашкова Марыя Вацлаваўна. Пад бібліятэку было выдзелена новае памяшканне, у якім таксама размяшчаўся і сельскі клуб.




***Будынак бібліятэкі-клуба***



***Бібліятэкар Шашкова М. В.***

У 2008 годзе Застадольская бібліятэка набыла статут бібліятэкі-клуба. Тут праводзяцца, як бібліятэчныя мерапрыемствы, так і клубныя.



*Вечар адпачынку “Ночь волшебства”*

## Какоўчынская сельская бібліятэка

Гісторыя Какоўчынскай бібліятэкі пачынаецца з восені 1944 года. Па рашэнню выканкама Багушэўскага раённага Савета дэпутатаў пры Какоўчынскім сельскім савеце была адкрыта ізба – чытальня. Кніжны фонд налічваў некалькі экз. літаратуры. Першай загадчыцай была Зацюпа Валянціна Паўлаўна, потым працавала Мірановіч Марыя Ільінічна, Шалапуха Вольга Грыгораўна – 1947–1949 гг.. З 1949 года па 1952 год загадчыцай была Заважанец Марыя Іванаўна, з 1952 па 1953 – Сліжова Софья Палікарпаўна, потым працавалі Манулін А. Б., Сліжова Л. І.. У 1954 годзе кніжны фонд перанеслі ў новае спецыяльна пабудаванае памяшканне. У 1961 годзе загадчыкам стаў Мельнікаў Міхаіл Іванавіч. Кніжны фонд у гэты час састаўляў 1906 экз. на суму 510 руб. 99 кап. У 1964 годзе Какоўчынская сельская бібліятэка стала дзейнічаць самастойна.

Пры бібліятэцы былі арганізаваны гурткі мастацкай самадзейнасці: харавы, драматычны, мастацкага чытання. За ўдзел у раённым аглядзе ў гонар 50- годдзя Савецкай улады ў 1967 годзе і ў гонар 50 - годдзя БССР у 1968 годзе калектыў мастацкай самадзейнасці быў узнагароджаны Граматамі райсавета дэпутатаў працоўных. Былі пастаўлены п’есы “Паўлінка”, “Прымакі”, “Дороги- пути”. Рэгулярна пісаліся лозунгі, якія прызывалі да паспяховага правядзення вясенняга сева, уборкі ўраджая і іншых палявых работ.

1974 года заг. бібліятэкі працавала Сідаровіч Людміла Якаўлеўна. Чытачоў было 500, кніжны фонд складаў 13 000 экз.

З 1975 года з людзьмі і для людзей жыла і працавала Вольга Сцяпанаўна Сахнова. Яна прыйшла зусім юнай, вучыла чытачоў пазнаваць свет, дапамагала знайсці ў ім сваё месца.



***Бібліятэкар Сахнова В. С.***

Прыветліва сустракала наведвальнікаў гэта цудоўная жанчына, аддаўшая служэнню кнізе і чытачу ўсё працоўнае жыццё. Вольга Сцяпанаўна – чалавек, які ўмее запаліць сэрцы людзей словам, прыкладам, своечасова парэкамендаванай кнігай. Стаж яе бібліятэчнай работы складае 28 год. Неаднаразова яна была ўзнагароджана Граматамі раённага дэпутатаў працоўных, ей выказваліся падзякі. У 1982 г. Какоўчынскай бібліятэцы прысвоена званне “Библиотека отличной работы”. На час яе працы быў самы высокі паказчык чытачоў- 755. Было праведзена шмат літаратурных вечароў, сустрэч, выстаў. Какоўчынская бібліятэка з’яўлялася школай перадавога вопыту па краязнаўству.

На змену Вользе Сцяпанаўне (2003 год) прыйшла Бешымыва Алена Барысаўна. Да гэтага яна працаввала дырэктарам мясцовага Дома культуры. Яна прадоўжыла работу па краязнаўству. Вядуцца альбомы “Гісторыя калгаса “Ясная зара”, “Подзвіг землякоў будзе жыць у вяках”, “Бой вялі не для славы”, “Удзельнікі вайны – нашы землякі”, “Ён не вярнуўся з вайны” (аб воіне-афганцу Русачэнка В.В.), “Адкуль імя ў вёсцы” і іншыя.

У 2009 годзе бібліятэка абслугоўвала 420 чытачоў.
Ёсць у бібліятэцы кніга “Рэкорды чытання года”. У канцы года самыя актыўныя чытачы ўзнагароджваюцца медалём “Супер-чытач”, а іх прозвішчы ўносяцца ў кнігу. Бібліятэка праводзіць разнастайныя масавыя мерапрыемствы.

## Канстантоўская сельская бібліятэка

У 1918 годзе ў в Казлы і в. Углы пачалі працаваць пачатковыя прыходскія школы. 29 лістапада гэтага ж года сяляне прагналі канстантоускага памешчыка Іахіма Абязерскага з маёнтка, куды і былі пераведзены школы.

Пры школе в. Канстантова адчынена хата-чытальня з кніжным фондам 100 экз. К пачатку 1941 года, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, літаратура была схавана ў падвале школы. У верасні 1944 года в. Канстантова была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Бібліятэка аднавіла сваю работу. У сакавіку 1956 года хата-чытальня была ператворана ў Канстантоўскую прыклубную бібліятэку. Фонд бібліятэкі – 1306 экз. У бібліятэцы працавала Крыштопенка Паліна Міхайлаўна. З 1957 па 1960 год бібліятэку ўзначальваў Казлоўскі Яўген Пятровіч. Потым на пасадзе бібліятэкара працуе Прыстаўка Ганна Фёдарауна. Яе у жніўні 1961 года змяніла выпускніца Мінскага вучылішча кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці Цыва (Валуева) Ганна Якаўлеўна, якая працавала да 10 чэрвеня 2003 года.



**Бібліятэкар Валуева Г. Я.**

У кастрычніку 1961 года бібліятэка атрымала новае памяшканне. Яна была размешчана ў будынку Канстантоўскага клуба. У 1962 годе прыклубная бібліятэка скарачаецца. Бібліятэчны фонд перадаецца у Дубавецкую сельскую бібліятэку. Там прадаўжае працаваць Валуева Г.Я. У верасні 1964 года адчынена Канстантоўская сельская бібліятэка і фонд перадаецца туды з Дубаўцоў. Праўленне калгаса выдзяляе грошы на набыццё мэблі для бібліятэкі.



***Бібліятэкар Стрыжнева Н. У.***

Пры Канстантоўскай сельскай бібліятэцы працавалі літаратурна-прапагандыстская і лектарская групы. Літаратурна-прапагандыстская група ў 1972 годзе заняла першае месца раённым аглядзе. Арганізаваны гурткі самадзейнасці, харавы, вакальны, танцавальны, драматычны. Актывізуецца масавая работа прапаганды літаратуры. Праводзяцца чытацкія канферэнцыі, агляды навінак літаратуры, сустрэчы з пісьменнікамі, тэматычныя і літаратурныя вечары, віктарыны, конкурсы. Вялікая ўвага ўдзяляецца патрыятычнаму і працоўнаму выхаванню.

У бібліятэцы ладзяцца ўрокі мужнасці і салдацкай славы, блакітныя агеньчыкі, вечары-успаміны, праводзіліся выязныя семінары.

У мэтах павышэння кваліфікацыі сельскіх бібліятэкараў Сенненская цэнтральная раённая бібліятэка практыкавала выязныя семінары ў лепшыя сельскія ўстановы культуры. Сярод іх была і Канстантоўская бібліятэка.

Бібліятэка з 1964 па 1969 год і з 1973 па 1984 гады займала першыя месцы сярод бібліятэк раёна па абслугоўванню чытачоў, а з 1985 па 1993 гады- 2 месца. За 40 год бібліятэчнай працы Валуевай Ганне Якаўлеўне ўручаліся граматы і дыпломы Міністэрства культуры БССР і СССР, Віцебскага ўпраўлення культуры, Сенненскага аддзела культуры, пераходныя вымпелы, знакі “Победитель соцсоревнования”, медаль “100 лет со дня рождения В.И.Ленина”.

У 1993 годзе зачыняюцца прыклубныя бібліятэкі ў вёсках Масяйкі, Станькі, Чудня, Дубаўцы. У выніку арганізоўваюцца бібліяткі-перасоўкі на жывёлагадоўчых фермах гэтых вёсак. У 1998 годзе ў сувязі з малым паступленнем літаратуры значная ўвага ўдзяляецца індывідуальнаму абслугоўванню на даму ў аддаленых населеных пунктах.

Стрыжнёва Надзея Уладзіміраўна на пасаду бібліятэкара прынята ў чэрвені 2003 года.

Бібліятэкар сумесна з СДК праводзіць Дзень маці, Дзень Перамогі, Дзень абароны дзяцей, Купалле, іншыя святы. Тут таксама праходзяць вечары працы, дыспуты, урокі права, маралі, экалогіі, круглыя сталы, гадзіны цікавых і карысных паведамленняў, гістарычныя чытанні і інш.

У час сельскагаспадарчых работ біліятэкар выязджае на палеткі з аглядамі навінак, мерапрыемствамі.



*У час уборкі ўраджаю Стрыжнёва Н. У.(першая справа)*

## Чырвонасельская сельская бібліятэка

Хата-чытальня ў весцы Казлоўка пачала працаваць адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны. Хто быў яе першым бібліятэкарам не высветлена. Гісторыя гэтай установы вядзецца толькі з 1968 года. Бібліятэкарам была прызначана Красноўская Тамара Паўлаўна. Кніг было мала, каля 500 экз.

На змену Красноўскай Т. П. прыйшла Курленка Людміла Міхайлаўна, якая працавала ў бібліятэцы толькі два гады. Потым на гэту пасаду назначаецца Мяцеліца Ларыса Іванаўна. Яна склала сістэматычны каталог, які потым пастаянна папаўняўся.

З 1973 года бібліятэка пераведзена ў новае памяшканне ў веску Папоўка, дзе знаходзіцца і зараз. На работу ў бібліятэку прыходзіць былая актыўная чытачка Броўка (Шыбека) Ірына Аляксандраўна, якая працавала да 2000 года да выхаду на пенсію. З назначэннем Ірыны Аляксандраўны бібліятэкарам, работа гэтай установы ажывілася. Папоўніўся кніжны фонд, абнавіўся інтэр'ер бібліятэкі, сталі працаваць гурткі. Чалавек, улюблены ў кветкі і прыроду, яна актыўна працавала па прапагандзе здаровага ладу жыцця і развіцці ў дзяцей і падлеткаў экалагічнай культуры. Пры біблятэцы пачаў працаваць клуб "Юны кветкавод". На занятках яго было цікава. Удзельнікі падарожнічалі па родных мясцінах, збіралі гербарыі, складалі букеты, праводзілі выставы і конкурсы. Гэта работа Шыбека І. А. была адзначана на рэспубліканскім узроўні. Бібліятэка ў 1996 годзе занала трэцяе месца ў конкурсе па экалагічнаму выхаванню.

Потым у Чырвонасельскую бібліятэку была накіравана выпускніца Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума Кулік Лілія Сяргееўна. Праз год на

месца бібліятэкара назначана Конышава Ганна Іванаўна, якая адразу ж паступіла на завочнае аддзяленне Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума.

Ганна Іванаўна ўмее падысці да чытача, прыцягнуць яго да работы бібліятэкі. Працуе ў цесным кантакце з мясцовым Домам культуры ладзіць з ім вечары -сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і працы, літаратурна-музычныя вечарыны, народныя святы, агеньчыкі.



***Конышава Г. І. у ролі Дзеда Мароза.***

Ладзяцца ў гэтай установе і святы народнага каляндара: Зажынкі, Купалле, Масленіца, Калядкі. Кожны год 1 чэрвеня бібіліятэкай адзначаецца Дзень абароны дзяцінства.



***Займальна-гульнёвая праграма “Здравствуй, лето звонкое”***

Традыцыяй гэтай бібліятэкі стала правядзенне святаў вёсак.



***Свята “И долог будет пусть ваш век”***

Бібліятэка прымае ўдзел у штогадовых конкурсах па добраўпарадкаванню і азеляненню прылягаючай тэрыторыі. У 2008 годзе Чырвонасельская бібліятэка атрымала па выніках гэтага конкурсу грамату.

У Чырвонасельскай бібліятэцы сабраны цікавы краязнаўчы матэрыял, які карыстаецца вялікім попытам. Зараз Ганна Іванаўна актыўна працуе па збору рэчаў, якімі карысталіся нашы продкі. Сабрана больш за сотню экспанатаў побыту землякоў, створаны этнаграфічны куток. У 2010 годзе на базе гэтай установы праведзены тэматычны семінар “Зберажэнне і развіццё лепшых народных традыцый”.



***Удзельнікі семінара***



***Паказальнае мерапрыемства семінара-свята “Зажынкі”***

## Латыгальская сельская бібліятэка



***Будынак бібліятэкі***

Першая хата-чытальня была адкрыта ў 1930 годзе , загадваў ёй Шалуха Сяргей Фядосавіч, ураджэнец вёскі Шалухі. У 1939 г. працаваў Аўсіевіч Пётр. Пасля вайны доўгі час у бібліятэцы працавала Шумкова А.Я.

Вялікі ўклад у развіццё бібліятэчнай справы ўнесла Платонава Тамара Барысаўна. Гэта быў вельмі старанны і добрасумленны чалавек. Яе работа была пастаўлена ў цеснай сувязі са школай і праводзілася на высокім узроўні. Гэта было заўважана кіраўніцтвам раёна і ёй прапанавалі працу ў Сенненскім аддзеле культуры.

У 1988 годзе пасля заканчэння Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума прыйшла працаваць Мялешка Ала Васілеўна.



***Бібліятэкар Мялешка А. В.***

На час знаходжання Мялешка А.В. ў дэкрэтным водпуску (1991- 1998 г.г.) бібліятэкарам працавала Аляксеенка Валянціна Фёдараўна. Праводзілася шмат цікавых мерапрыемстваў сумесна з клубам. Валянціна Фёдараўна арганізавала пры бібліятэцы клуб “Лекі з зялёнай аптэкі”. Яна сабрала розныя лекавыя расліны, падрабязны матэрыял нетрадыцыйнага метада лячэння. Чытачы з задавальненнем карысталіся паслугамі клуба.



***Бібліятэкар Аляксеенка В.Ф. уручае чытачам лекавыя расліны***

Доўгі час бібліятэка знаходзілася пры сельскім клубе і толькі ў 2003 годзе атрымала лепшае памяшканне.

Латыгальская бібліятэка абслугоўвае вёскі Асінаўку, Шалухі, Гарнакі, Леснікі, Сіманаўку, Заазер’е. На 01.01.2009 года аблугоўваецца 220 чытачоў, кніжны фонд – 4 611 экз. Бібліятэка праводзіць розныя формы масавай прапаганды кнігі. Так цікава прайшоў конкурс малюнкаў “ Намалюй мару” сумесна з сельскім клубам і службай сацыяльнай бяспекі. Праходзяць літаратурныя часы, гадзіны цікавых паведамленняў, займальна-пазнавальныя гульні.

## Лучазарненская сельская бібліятэка

У Чырвоным Беразе (зараз в. Лучазарнае) у 1952 годзе стала працаваць бібліятэка. Размяшчалася яна у памяшканні сельскага клуба. На пасадзе бібліятэкара і загадчыка клуба працавала Камарова Ніна, а ў 1976 годзе туды працаваць прыйшла Сапроненка Тамара Іванаўна, якая з 1956 года па 1970 год працавала загадчыцай Леднівіцкай бібліятэкі і сельскага клуба.



***Бібліятэкар Сапроненка Т. І.***

За прапаганду лепшых твораў беларускай літаратуры, за патрыятычнае, эстэтычнае, працоўнае выхаванне Тамара Іванаўна ў 1959 годзе была ўзнагароджана Граматай Міністэрства культуры БССР. Яна вялікую ўвагу таксама ўдзяляла выхаванню падрастаючага пакалення, прыцягненню чытачоў у бібліятэку, правядзенню масавай работы. Ў 1973 годзе пры бібліятэцы стаў працаваць літаратурны гурток для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Удзельнікі гуртка рыхтавалі лялечныя спектаклі, з якімі дзеці выступалі перад жыхарамі вёскі. За добрую работу бібліятэкар неаднаразова ўзнагароджвалася Граматамі.

У верасні 1977 года бібліятэкарам Лучазарненскага ф.№29 назначана Стук (Драздова) Лідзія Фёдараўна, якая працавала ў гэтай установе культуры да 1982 года.

У 1989 годзе Лучазарненскую бібліятэку-філіял узначаліла Стрыжнёва Алена Георгіеўна. Якая працавала тут да лістапада 2009 года. Яна старалася актывізаваць работу з дзіцячым чытачом. Запрашала іх на розныя мерапрыемствы, наведвала разам з дзецьмі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Старалася данесці кнігу да кожнага жыхара сваей зоны абслугоўвання.

Фонд бібліятэкі складаў каля 8000 экз. За апошнія гады колькасць чытачоў і кнігавыдач зменшылася. Частка фонду была перададзена ў іншыя бібліятэкі. Бібліятэка стала працаваць на паўстаўку. Бібліятэкарам прызначаны Стрыжнёў А.Е.



***Вечар да Дня Маці***

# Машканская сельская бібліятэка

У 1927 годзе пры Машканскім сельскім савеце была створана ізба-чытальня. У той час у ёй знаходзілася невялікая колькасць кніг . Загадчыцай стала Гапава Паліна Афанасаўна. Потым загадчыкамі былі Самсонека, Гайтон, Ляхоўская. Гаршкоў, які з'яўляўся сакратаром партыйнай арганізацыі, адначасова ўзначальваў і хату-чытальню. Кніг у гэты час у чытальні было 500 экзэмпляраў. У асноўным гэта былі кнігі рэлігійнага зместу.

У час Вялікай Айчыннай вайны ўсе кнігі былі знішчаны. Пасля Перамогі пачалося аднаўленне гаспадаркі. Наладжвалася культурнае жыццё вёскі. Адразу ж пасля вайны загадчыцай хаты-чытальні стала працаваць Кулік Зінаіда Пятроўна. Ей удалося сабраць у бібліятэку ўсяго 50 кніг.

З 1946 па 1951 год бібліятэкарам Машканскай хаты-чытальні працаваў Стралкоў Даніла Клімавіч. Ён жа быў сакратаром партыйнай арганізацыі. Потым Данілу Клімавіча выбралі на пасаду старшыні Машканскага сельскага Савета.



У *гэтым доме раней размяшчалася ізба - чытальня*

З 1951 па 1954 год узначальвала бібліятэку Шалуха Лідзія Іванауна.
На працягу 13 гадоў (1954-1967 гг.) заведвала бібліятэкай Пучкова Галіна Іванаўна. К таму часу бібліятэка налічвала 1 500 экз.літаратуры. Размяшчалася яна ў цесным памяшканні пры Савеце.

З 1967 годзе да 50-годдзя Савецкай улады ў в. Машканы быў пабудаваны клуб. У гэтым будынку выдзелены 2 пакоі пад бібліятэку. Пучкоўскую Г.І. перавялі працаваць у Бялькоўскі сельскі клуб, а Машканскую бібліятэку ўзначаліла Когаль Ганна Леанідаўна.



***Будынак Машканскага Сельскага Дома культуы,***
***дзе размешчана бібліятэка***

Кніжны фонд бібліятэкі налічваў больш 4000 экз. Былі арганізаваны бібліятэкі-перасоўкі ў вёсках Масоры і Сімакі. Бібліятэка ўключылася ва Усесаюзную пераклічку сельскіх бібліятэк. Сталі праводзіцца гучныя чытанні, бібліяграфічныя агляды, гутаркі, дыспуты, лекцыі. 1 раз у тыдзень арганізоўваліся ленінскія чытанні. Моладзь в. Машканы прыняла самы актыўны ўдзел ва Усесаюзнай чытацкай канферэнцыі “Запаветам Леніна верныя”.

З 1968 па 1969 год бібліятэкарам працавала Чудакова Ніна Анатолеўна. З жніўня 1969 года па жнівень 2006 года бібліятэку ўзначальвала Карэнда Тамара Іванаўна. Працоўны стаж яе – 37 год.



***Бібліятэкар Карэнда Т. І.***



***Тамара Іванаўна на свяце вёскі Масоры (пачатак 80-х г.)***

Работа бібліятэкі была вельмі цікавай. Колькасць чытачоў расло. Актыўнымі чытачамі былі дзеці. Працаваць Тамары Іванаўне дапамагалі чытачы Шухто Таісія Іванаўна і Міська Любоў Васілеўна. У аддаленых вёсках былі створаны бібліятэкі-перасоўкі. Адной з лепшых бібліятэкараў-перасоўшчыкаў была Бярозка Таісія Іванаўна.

У 2006 годзе на пасаду бібліятэкара Машканскай бібліятэкі-філіяла №30 была назначана Пятрова Таццяна Леанідаўна, былы бібліятэкар Машканскай сярэдняй школы.

Вёска Машканы набыла статут аграгарадка. У сувязі з гэтым работа бібліятэкі актывізавалася. Пры бібліятэцы сталі працаваць любіцельскія аб,яднанні і клубы. Бібліятэка набыла камп’ютэр, новую мэблю, тэлевізар, DVD. Падключаны Інтэрнэт і электронная пошта.




***Дзіцячая забаўляльна-гульнёвая праграма “Дзеці. BY”***

У 2009 годзе на базе Машканскай бібліятэкі быў арганізаваны выязны тэматычны семінар “ Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк як фактар духоўнага адраджэння”.

На семінары адбылася карысная і цікавая прэзентацыя краязнаўчага альбома “Свята Саракі”, заснаванага на мясцовым матэрыяле.



***Прэзентацыя краязнаўчага альбома “Саракі”***



***Вядомыя і любімыя кніжныя героі***

Пры бібліятэке дзейнічае клуб “Паўлінка”, які карыстаецца папулярнасцю сярод жанчын.

Сумесна з удзельніцамі клуба бібліятэкар стварыла знакаміты Машканскі абярэг. На працягу апошніх год Машканская бібліятэка ўваходзіць у лік лепшых бібліятэк Сенненскай ЦБС. Неаднаразова ўзнагароджвалася граматамі. У 2010 годзе прымала ўдзел у конкурсе прафесійнага майстэрства “Я – бібліятэкар” і была першай у намінацыі “ Лепшы літаратуразнаўца”. У 2012 годзе партрэт Пятровай Т.Л. занесены на раённую Дошку гонару.

## Нямойтаўская сельская бібліятэка

Адразу пасля вайны ў бібліятэцы працаваў Пракаповіч Фёдар Кузьміч. У 1958 годзе сіламі моладзі будаваўся клуб, тут знаходзілася і прыклубная бібліятэка. З 1962 па 1964 г.г. працавала Манькоўская Таццяна Якаўлеўна.

У 1964 годзе прыняла бібліятэку Цівінская Людміла Андрэеўна (Шылько), яна працавала заг. клубам і прыклубнай бібліятэкай. На пасаду загадчыцы Нямойтаўскай сельскай бібліятэкі пераведзена ў 1969 годзе.

На базе Нямойтаўскай сельскай бібліятэкі была створана школа перадавога вопыту па сельскай гаспадарцы дзе праводзіліся раённыя семінары. Бібліятэка удзельнічала ў аглядах-конкурсах на лепшую пастаноўку культурна-адукацыйнай работы сярод жывёлаводаў. Шылько Людміла Андрэеўна была ўзнагароджана Ганаровай граматай Упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама.

У 1998 годзе бібліятэкар пайшла на заслужаны адпачынак. Яе змяніла Мудрак Ірына Васільеўна. Пры ёй была наладжана цесная сувязь з Нямойтаўскім Домам культуры.



***Бібліятэкар Мудрак І. В.***

У 2007 годзе на базе гэтай установы прайшоў семінар “Беларускае слова– крыніца духоўнасці”, прысвечаны 125–годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа і Янкі Купалы.




***Удзельнікі семінара***

У снежні 2009 года бібліятэку прыняла Курс Аксана Мікалаеўна. Бібліятэкай абслугоўваецца 390 чытачоў. Ім выдаецца 7900 экз. літаратуры.

## Обальская сельская бібліятэка

Обальская бібліятэка была адкрыта ў 60-ыя гады. Яна знаходзілася пры Обальскім клубе. Займаўся бібліятэкай Новікаў Іван Іванавіч на грамадскіх пачатках. У канцы 60-ых бібліятэка стала самастойнай структурай. У розныя гады ў Обальскай бібліятэцы працавалі: Прыстаўка Валянціна Іванаўна, Прыстаўка Раіса, Кучко Галіна Пятроўна, Карнілава Л.А., Шкамброва Л.П., Цярэня Т.П.. У жніўні 1976 года бібліятэку прыняла Кузняцова Зінаіда Васілеўна, якая працуе па цяперашні час.



***Бібліятэкар Кузняцова З.В.***

Бібліятэка заўжды працавала сумесна з клубам, школай, заводам кармавых дабавак. У 70-80-ыя гады праходзілі вечары - ўшанаванні передавікоў прамысловасці. У бібліятэцы маецца фотаальбом “Аб людзях і справах Обальскага біяхімічнага завода”. Не толькі дзеці ў свой час, але і ўнукі з задавальненнем разглядваюць альбом, таму што гэта гісторыя.

Бібліятэкар арганізоўвае самыя розныя мерапрыемствы: тэматычныя ранішнікі, віктарыны.

Цікава праходзяць у бібліятэцы конкурсы малюнкаў, іх сабрана цэлая калекцыя.



***Будынак бібліятэкі***



***Ранішнік “Дзень добры, зіма”***

Вялікая ўвага бібліятэкарам удзяляецца прапагандзе здаровага ладу жыцця. Праводзяцца ўрокі здроў'я, сустрэчы з медработнікамі, афармляюцца кніжныя выставы, падборкі літаратуры і інш.

Вечары Памяці, вахты, мітынгі каля памятніка – гэта частка мерапрыемстваў, прысвечаных ваенна-патрыятычнаму выхаванню.

У бібліятэцы сабраны ўспаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

У 1991 годзе ў в.Обаль адкрылася пачатковая школа. Настаўнікі і вучні прымалі актыўны ўдзел ў брэйн - рынгах, КВЗ, інтэлектуальных лато, "Поле цудаў", часах красвордаў. Традыцыйным стала састаўленне разам з дзецьмі - чытачамі сваёй радаслоўнай.

У 1998 годзе бібліятэка атрымала новае памяшканне. Плошча яго саставіла 48 кв.м.

Сталі дзейнічаць абанемент, чытальная зала, дзіцячы пакой.

У гэтым жа годзе бібліятэкару была ўручана Ганаровая грамата аддзела культуры.

2000 годзе на базе бібліятэкі прайшоў тэматычны выязны семінар "Прафесійны імідж бібліятэкара". Першае месца ў абласным аглядзе-конкурсе прафесійнага майстэрства ў намінацыі

"Прапаганда літаратуры" заняла бібліятэка ў 2003 годзе. Партрэт Зінаіды Васілеўны быў змешчаны на раённую Дошку Гонару.

Дзейнічала праграма літаратурна - эстэтычнага цэнтра "Натхненне" – папулярызацыя мастацкай літаратуры і фальклора.

Для жанчын створаны клуб "Святліца". Пасяджэнні носяць пазнавальны і практычны характар.

## Пламенская сельская бібліятэка

У вёску Полымя бібліятэка была пераведзена 3 сакавіка 1993 года з вёскі Асінаўка. Першай загадчыцай была Зарубіцкая Лідзія Ільінічна. Кніжны фонд збіралі з усіх бібліятэк раёна. Лідзія Ільінічна з душой адносілася да бібліятэчнай справы. Каб прыцягнуць насельніцтва да чытання, яна разносіла кнігі па весках Малая і Вялікая Пярэспа, Відокі, Атраднае і Бачарова.

У 70-ых гадах на пасадзе бібліятэкара яе змяніў Ракаў Міхаіл Андрэевіч, які працаваў да 1993 года.

Пасля прыйшла працаваць у гэту ўстанову Хірэвіч Валянціна Мікалаеўна.



***Бібліятэкар Ракаў М. А***



***Свята “Народнага каляндара”***



***Бібліятэкар Хірэвіч В. М.***

Кніжны фонд на той час складаў больш за 9 тыс. экз. Бібліятэка абслугоўвала 510 чытачоў. Валянціна Мікалаеўна шмат увагі ўдзяляе масавай прапагандзе кнігі. Праводзяцца святы народнага каляндара, конкурсы, вечарыны, блакітныя агеньчыкі, займальна-пазнавальныя праграмы, ранішнікі, інтэлектуальныя гульні.



***Удзельнікі інтэлектуальнай гульні***

Работа вядзеца ў цесным кантакце са школай, дзіцячым садком, клубам.



***Бібліяграфічны ўрок “Знаёмства з бібліятэкай”***

Адной з найбольш цікавых і дзейсных форм масавай работы з’яўляецца тэатралізаванае прадстаўленне, у якім Валянціна Мікалаеўна як правіла выконвае галоўную ролю.



***Навагодняе свята***

Валянціна Мікалаеўна прымае самы актыўны ўдзел у раённых святах.



***Раённае свята “Сенакос – 2008”***



***Раённае свята “Дажынкі – 2007”***

# Першамайская сельская бібліятэка

Першамайская сельская бібліятэка была адкрыта 20 лістапада 1955 года ў клубе в. Рошчына, дзе мелася 400 экз. кніг, было 43 чытачы. Першай загадчыцай была Печкурова Людміла Сямёнаўна, потым працавалі Хлышч Зінаіда Маркаўна, Румо Мікалай Рыгоравіч.



***Першы будынак бібліятэкі***

На 01.01.1968 года кніжны фонд састаўляў 7 843 экз., было 290 чытачоў. Актыў бібліятэкі ў колькасці 7 чалавек састаўлялі інтэлігенцыя, спецыялісты с/г, якія аказвалі дапамогу ў правядзенні вечароў моладзі, канферэнцый і г.д. Актывісты з'яўляліся лектарамі, яны чыталі лекцыі на тэмы: "Навстречу 50 – летию БССР", "Задачи юбилейного года", "Наука и религия", "Картофель – 2-й хлеб", "50 лет ВЛКСМ".

Пры бібліятэцы былі створаны тры гурткі мастацкай самадзейнасці: харавы, драматычны, мастацкага чытання.



***Удзельнікі драматычнага гуртка на сцэне мясцовага клуба***

У 1966 годзе бібліятэка была ўдастоена звання "Библиотека отличной работы" Была ўручаны граматы Міністэрства культуры СССР у гонар 45 - годдзя Вялікага Кастрычніка, абласнога ўпраўлення культуры, раённага

аддзела культуры. У 1968 годдзе выпісвалася 37–40 найменаванняў газет і часопісаў.

У 1981 годдзе бібліятэку прыняла Зуева Раіса Леанідаўна. Асноўныя паказчыкі работы на той час: 440 чытачоў, кнігавыдача – 8329. Бібліятэкар займала першыя месцы ў сацыялістычным спаборніцтве (1982, 1984 г.г.) і за добрую працу ўзнагароджвалася граматамі.




***Удзельнікі семінара бібліятэчных работнікаў***

З 2003 года працавала Каўрыжэнка Юлія Віктараўна. Яна наладзіла добрую сувязь са школай. Рэгулярна праводзіліся падворныя абходы, на асаблівым уліку – ўдзельнікі ВАВ. У 2007 годзе бібліятэку прыняла Хачатран Парандзэм Седракаўна. Стаў інтэнсіўна папаўняцца кніжны фонд новымі выданнямі. У 2008 годзе бібліятэка атрымала 815 экз. аформлены стэнд лепшых чытачоў, праводзяцца экскурсіі, святы дзіцячага чытання.

## Падворыцкая сельская бібліятэка

Падворыцкая бібліятэка стала функцыяніраваць адразу ж пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1925 годзе быў адчынены клуб. Пры ім працавала бібліятэка. Установы размяшчаліся ў былым панскім доме. Кніжны фонд быў невялікі. Першы бібліятэкар – Дунец Пётр Сідаравіч. Працаваў ён да 1934 года. Працаваць яму дапамагаў загадчык лікбеза настаўнік Вярцінскі В.Г. У 1934 годзе Дунец П.С. перайшоў працаваць настаўнікам. На яго месца быў рэкамендаваны Духовіч Ягор Маісеевіч. Актывісты–камсамольцы на чале з бібліятэкарам шукалі сродкі для набыцця кніг. Імі быў падрыхтаваны платны спектакль “Святы айцец”. На выручаныя грошы была набыта літаратура, грамафон, фіранкі, шкаф. Гэты ж спектакль быў паказаны і на свята Вялікдня.

Пасля яго паказу мясцовы святар адказаўся весці службу, стаў актыўным удзельнікам культурна–асветніцкай работы. Царква была ў вёсцы Падворыца зачынена. У яе перавялі бібліятэку, дзе яна размяшчалася да 1941 года. У час вайны будынак бібліятэкі, кніжны фонд і ўся маёмасць згарэлі.

25 чэрвеня вёска Падворыца была вызвалена. Старшынёй савета выбраны былы бібліятэкар Духовіч Е.М. Ён узнавіў работу бібліятэкі. На пасаду бібліятэкара сельскі Савет рэкамендаваў Баранок Ганну Навумаўну, энергічную маладую дзяўчыну. Вялікая работа ёю праводзілася па камплектаванню кніжнага фонда. Сельскі савет звярнуўся за дапамогай да загадчыка райкультпрасвета Кажарскаму В. З фонда раённай бібліятэкі было выдзелена 67 экз. літаратуры. Дапамог набыць кнігі і савет. Работа бібліятэкі актывізавалася. Праводзіліся гучныя чытанні, лекцыі, вечары.

У 1949 годзе пад хату-чытальню было куплена асобнае памяшканне. Бібліятэкарам стала працаваць Уліцкая А.В. Кніжны фонд бібліятэкі ў той час складаў каля 200 экз.

З 1950 года на пасаду бібліятэкара хаты-чытальні быў назначаны дэмабілізаваны з радоў Савецкай Арміі Пансевіч А.А.



***Бібліятэкар Пансевіч А. А.***

І зноў закіпела культурнае жыццё ў Падворыцы. Чытачоў было 262. Аддзел культуры адправіў Пансевіча на 10-месячныя курсы. Пасля курсаў работа хаты-чытальні яшчэ больш ажывілася. Сумесна са школай ладзіліся ранішнікі, блакітныя агеньчыкі, гутаркі, дыспуты.

З 1959 года па чэрвень 1995 года бібліятэкарам працавала Пансевіч Лідзія Навумаўна.



***Бібліятэкар Пансевіч Л. Н.***

Бібліятэка ў гэты час размяшчалася сумесна з клубам у спецыяльна пабудаваным памяшканні. Пансевіч Л.Н. была энтузіястам бібліятэчнай справы. Яна старалася давесці кнігу да кожнага чытача, прапагандавала лепшыя творы літаратуры, вяла патрыятычнае, эстэтычнае, працоўнае выхаванне. Кніжны фонд бібліятэкі складаў больш за 9000 экз. Пасля выхаду Лідзіі Навумаўны на заслужаны адпачынак бібліятэкарам стала працаваць Баранок Святлана Мікалаеўна.

У 1997 годзе бібліятэка была пераведзена ў памяшканне былога дзіцячага садка. Месца для яе стала значна больш, што дало магчымасць раскрыць кніжны фонд і актывізаваць чытанне. Тэрыторыя ўстановы культуры былы агароджана, пасаджана шмат кветак.



***Тэатралізаванае прадстаўленне “Кніжкіны імяніны”***

З 1999 года бібліятэкарам працуе Лабецкая Анжэла Мікалаеўна – актывістка ўсіх мерапрыемстваў бібліятэкі і клуба.



***Будынак бібліятэкі***

З снежня 2001 года на пасаду бібліятэкара назначана Талстая Святлана Мікалаеўна, а ў лютым 2004 – Талстая (Яцкевіч) Ірына Мікалаеўна, якая закончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. Зараз Ірына Мікалаеўна абслугоўвае 250 чытачоў. У карыстанне ім прадстаўлены фонд у колькасці 8 000 экз.



*Бібліятэкар Талстая І. М.*

Ірына Мікалаеўна выхоўвае маладое пакаленне праз тэатралізаваныя часы, экалагічныя святы, літаратурныя гульні.



*Удзельнікі гуртка "Очень умелые ручки"*

Ёй арганізаваны гурток "Очень умелые ручки", у якім дзеці займаюцца вышываннем, робяць падзелкі з прыроднага матэрыялу.

## Пустынкаўская сельская бібліятэка

У 1918 годзе ў вёсцы Пустынкі знаходзілася ў маленькім будынку знаходзілася хата-чытальня. Кніжны фонд складаў 500 экз. Першым бібліятэкарам была Васілеўская Аляксандра Канстанцінаўна, настаўнік па адукацыі. Потым 5 год бібліятэкарам стала працаваць Калініна. Даваенныя звесткі аб рабоце бібліятэкі не захаваліся. У час вайны ўвесь кніжны фонд загінуў. Адразу ж пасля вызвалення населенага пункта стала збірацца літаратура і была адчынена бібліятэка.



*Першы бібліятэкар Васілеўская Аляксандра Канстанцінаўна*

Многа бібліятэкараў змянілася за гэты час – Васілеўскі В.В., Іванова С.М., Шчупіна В.Д., Астроўская А., Стрыжнёў А.І. і ншыя.

З 1973 года бібліятэку ўзначальвае Рабцава (Гарнак) Надзея Васілеўна.



***Бібліятэкар Гарнак Н. В.***

## *Из воспоминаний Надежды Васильевны Гарнак, библиотекаря Пустынковской сельской библиотеки.*

*Любовь к книге, а может и к моей профессии библиотекаря Пустынковской сельской библиотеки, в которой я сейчас работаю 33 года, привил мой отец Рябцев Василий Демидович, бывший учитель Алексиничской средней школы, который работал в школьной библиотеке.*

*Мне тогда было шесть лет, когда у нас дома стояли шкафы с книгами школьной библиотеки, а отец был библиотекарем. У нас дома находилось несколько классов Алексиничской СШ. Долгими зимними вечерами любимым моим занятием было общение с книгой, чтение их на печке при керосиновой лампе, а также я часами перекладывала книги из шкафа в шкаф, помогая папе наводить порядок. Мне было восемь лет, когда я читала вслух газеты детям, которые учились у нас дома.*

*Огромное количество книг я прочитала в Алексиничской средней школе, в сельской библиотеке, где библиотекарем работала молодая девушка – Шадуйкис Зина. С какой торжественностью мы шли записываться в сельскую библиотеку – именно, может, тогда зародилась у меня мысль стать библиотекарем, нести людям мудрость книги.*

*Моя любимая книга детства «Никогда не забудем». Все школьные сочинения я писала без ошибок на «хорошо» и «отлично» благодаря большой начитанности и зрительной памяти.*

*теперь, работая в Пустынковской сельской библиотеке, говорю детям, чтобы грамотно писать, надо много-много читать книг.*

*Приходилось встречать людей, которые не понимают огромного значения библиотеки, становится больно за человека, который совсем не читает книг, не узнаёт большой и прекрасный мир.*

*Библиотеки будут жить, другое дело какими будут сами книги, но они обязательно останутся, не исчезнут, а вместе с ними останется и профессия библиотекаря. Библиотекарю надо много знать. Не возможно предугадать все вопросы, с которыми к библиотекарю обратятся читатели.*

*Прибыли новые книги – встреча с неизведанным, чем-то большим. Пришли новые журналы и газеты – опять уйма интересного и неожиданного …*



У той час фонд складаў 1800 экз., бібліятэка абслугоўвала 420 чытачоў. Колькасць чытачоў больш за 10 год трымаўся амаль на адным узроўні. У 1982 годзе Надзея Васілеўна закончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. Наладжвалася масавая прапаганда кнігі, збіраўся краязнаўчы матэрыял.

Праводзіліся вечары - сустрэчы, літаратурна - музычныя кампазіцыі, конкурсы, віктарыны, тэматычныя ранішнікі.

Пры падвядзенні раённага конкурсу “Радаслоўная роднага краю” адной з лепшых прызнана і Пустынкаўская бібліятэка.



***Краязнаўчыя матэрыялы***

Пасля 2000 года колькасць насельніцтва ў зоне абслугоўвання значна зменшылася, засталося каля 220 чытачоў.

На працягу ўсёй сваёй работы Надзея Васілеўна вялікую ўвагу ўдзяляла рабоце з дзіцячым чытачом.



***Выстава дзіцячых малюнка***

Пры бібліятэцы працаваў экалагічны гурток “Крынічка”. Формы паседжанняў былі самыя розныя: экскурсіі-назіранні, экалагічныя часы, урокі дабрыні і ветлівасці, падарожжы па кнігах, выставы падзелак.



***Кніжныя выставы***

## Рулёўшчынская сельская бібліятэка

Рулёўшчынская сельская бібліятэка ўпершыню адчыніла свае дзверы для чытачоў 25 жніўня 1965 года. Гэта адбылося, калі ад саўгаса “Полымя” аддзяліўся самастойны саўгас імя Данукалава. Першым бібліятэкарам з 1965 па 1968 год працавала Галіна Іосіфаўна Шляхта.

У 1968 годзе ў саўгасе быў пабудаваны сельскі клуб і бібліятэка атрымлівае невялікае памяшканне. Загадчыцай становіцца выпускніца Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума Федарышчанка Анастасія Дзмітрыеўна, потым там працуе Гарбачова Ніна Міхайлаўна, Астаповіч Галіна Мікалаеўна.

З мая 1971 года бібліятэку прымае Догіль Людміла Васілеўна.



***Бібліятэкар Догіль Л. В.***

Адным з галоўных напрамкаў Людміла Васілеўна выбрала краязнаўства. У бібліятэцы пастаянна працавала выстава народных умельцаў. Запрашаліся на сустрэчы ветэраны вайны і працы. Бібліятэка шмат увагі надавала рабоце з юнымі чытачамі.

У 1974 бібліятэка атрымала новае памяшканне, цяпер яе плошча складае 60 кв. м. На працягу 36 гадоў Людміла Васілеўна ўсе свае веды і намаганні аддавала вывучэнню гісторыі, адраджэнню спадчыны. У 2007 годзе Догіль Людміла Васілеўна ідзе на заслужаны адпачынак. На змену прыходзіць Сінічэнка Валянціна Канстанцінаўна, якая раней працавала ў Беліцкай бібліятэцы. Бібліятэкар шмат ўвагі ўдзяляе добраўпарадкаванню, стварэнню камфорту. У 2008 годзе на базе гэтай ўстановы прайшоў тэматычны выязны семінар “Маральна–прававое выханне чытачоў”. Валянціна Канстанцінаўна падрыхтавала да семінара час прававых ведаў “Твае правы, падлетак”.



***Бібліятэкар Сінічэнка В. К.***

У 2009 годзе паслугамі бібліятэкі карысталася 350 чытачоў, кнігавыдача складае 8 тысяч экз., кніжны фонд –7 500 экз. Значную ўвагу бібліятэка ўдзяляе збору мясцовага фальклорнага матэрыялу. Для школьнікаў праводзяцца літаратурныя вандроўкі і вечары, тэатралізаваныя гадзіны, вечары, конкурсы. Арганізоўваюцца мерапрыемствы сумесна з Рулёўшчынскім клубам.

У 2012 годзе бібліятэку ўзначаліла Саўлевіч Тамара Міхайлаўна.

# Рыбненская сельская бібліятэка

Гісторыя Рыбненскай сельскай бібліятэкі пачынаецца з 1962 года. Бібліятэка размяшчалася ў будынку клуба.




Для яе быў адбіты куточак з дошак. Стэлажы ў бібліятэцы былі самаробныя. Першым бібліятэкарам на добраахвотным пачатку стаў Старавойтаў Мікалай Кузьміч. Асноўная яго работа – жывёлавод. Пасля работы на ферме ён ішоў у бібліятэку і выдаваў літаратуру. Першым чытачом Рыбненскай бібліятэкі стала Падковіна Лілія Уладзіміраўна.



У лютым 1969 года, пасля заканчэння Багушэўскай СШ, на работу.
Ў бібліятэку была прызначана Сапега (Лясун) Тамара Ігнатаўна, якая ўзначальвала гэту ўстанову да пенсіённага ўзросту, 2009 года. За час работы Тамара Ігнатаўна завочна набыла бібліятэчную спецыяльнасць (1984 год), стала добрым бібліятэкарам, актыўным прапагандыстам кнігі.



***Бібліятэкар Сапега Т. І.***

У 1970 годзе быў пад бібліятэку выдзелілі памяшканне былой канторы саўгаса. Былі набыты новыя стэлажы, кафедра, кніжныя выставы.
З 1976 па 1977 год у бібліятэцы часова працавала Старавойтава Т.А.

У 1977 годзе Рыбненская бібліятэка ўвайшла ў Сенненскую цэнтралізаваную бібліятэчную сістэму (бібліятэка-філіял №44). Патрабаванні да бібліятэчнай работы ўзраслі. Стаў лепей камплектавацца кніжны фонд. У практыку работы ўводзіліся новыя формы прапаганды літаратуры. Сваёй галоўнай задачай Тамара Ігнатаўна лічыла прыцягненне да чытання дзяцей і моладзі.



***Актывісты масавых марапрыестваў бібіліятэкі***

Абслугоўванне на даму кнігай вецеранаў- адзін з напрамкаў работы бібліятэкі. Ветэраны штогод запрашаліся на сустрэчы з чытачамі. На вечарах яны расказвалі дзецям і моладзі аб цяжкіх ваенных гадах, аб салдацкай мужнасці . Такія сустрэчы ўносяць свой уклад у патрыятычнае выхаванне чытача.



***Чытачы – ветэраны***

Вялікая ўвага ў бібліятэцы ўдзяляецца афармленню і добраўпарадкаванню прылягаючай тэрыторыі.



Пры Рыбненскай сельскай бібліятэцы больш за дзесяць гадоў працавалі гурткі “Верасок” (краязнаўчага накірунку) і “Умелыя рукі” (кнігалюбаў).Гурткоўцы рамантавалі кнігі, удзельнічалі у мерапрыемствах, азелянялі бібліятэку.




***Выстава падзелак удзельнікаў гуртка “Верасок”***

Не застаюцца без увагі бібліятэкара і шматдзетныя матулі. Для іх ладзяцца агеньчыкі, сямейныя святы, конкурсы.



На гэтым здымку Логінава Ганна Васілеўна, мнагадзетная маці. Яна нарадзіла і выгадавала 8 дзетак. Сама ж з’яўляецца актывісткай бібліятэчнай работы і добрым чытачом.

У лістападзе 2009 года на работу ў Рыбненскую бібліятэку-філіял №44 пераведзена бібліятэкар 2 катэгорыі Стрыжнёва Алена Георгіеўна.

## Раснянская сельская бібліятэка

У вёсцы Расна ў 1958 годзе запрацавала хата-чытальня, загадвала ёю Дуброўская (Ціханская) Валянціна Аляксееўна. Памяшканне бібліятэкі складў адзін маленькі пакой. Яе маёмасць: 1 стол, 1 стул. Кніжны фонд размяшчаўся ў 2 шафах. У бібліятэцы праводзіліся літаратурна-мастацкія вечары, вечары пытанняў і адказаў, іншыя мерапрыемтвы. Вялікая ўвага для прыцягнення чытачоў ў бібліятэку ўдзялялася ў той час штодзённым падворным абходам.



***Чытачы каля бібліятэкі***

“Чалавек на сваім месцы” – так казалі пра Зінаіду Фёдараўну Ціханскую. Каля трох дзесяцігоддзяў яна з добразычлівай усмешкай

сустракала сваіх чытачоў, далучаючы іх да таямнічага міру кнігі. Яе добрыя справы і сёння памятаюць жыхары вёсак Расна, Васількова, Камарова, Бабаедава, Пацкава, Вароніна і Сякірына.




***Бібліятэкар Ціханская З. Ф.***

"Бібліятэчная душа" – гэта аб Лысянковай Зінаідзе Дзмітрыеўне. Калісьці яна выбрала свой лёс – служэнне чытачу. І аддала яму два дзесяцігоддзі. На базе гэтай установы ў 2005 годзе быў праведзены раённы семінар "Фарміраванне маральна-духоўных каштоўнасцей у чытача".



***Удзельнікі семінара***



***Тэатралізаванае прадстаўленне***

Шмат часу яна ўдзялала рабоце з дзецьмі і падлеткамі.



***Бібліятэкар Бярговіна Т. Ф.***

Бібліятэчнае прызначэнне … Гэта калі часткай твайго жыцця становяцца людзі і кнігі. Студэнту-завочніку падабраць літаратуру к заняткам, з дзіцяці абмяркаваць толькі што прачытаную казку, пераканаць падлетка прачытаць тую ці іншую кнігу, проста паразмаўляць з чытачом, выслухаць чалавека.

Бярговіна Таісія Фёдараўна прыйшла працаваць у бібліятэку ў 2009 годзе. Закаханая ў сваю справу, дабрэйшай душы чалавек, да якой ідуць за парадай, расказваюц пра радаснае і набалелае. Раснянская бібліятэка зараз мае ўтульнае памяшканне, гэта бібліятэка з кніжным фондам, які складае больш за 5 тысяч экзэмпляраў. Бібліятэка абслугоўвае 250 чытачоў.

Увазе чытачоў бібліятэка прадастаўляе выставы-прагляды новых паступленняў, тэматычныя кніжныя выставы, бібліяграфічныя агляды. Традыцыйнымі сталі сустрэчы ў бібліятэцы з цікавымі жыхарамі вёскі і ветэранамі.

Бібліятэкар вядзе работу па збору матэрыяла аб сваім краі, раёне, знакамітых земляках.



***Будынак бібліятэкі***

# Сінягорская сельская бібліятэка

У канцы 1956 г. быў пабудаваны будынак, у якім знаходзілася кантора калгаса, клуб і выдзелены невялікі пакой для бібліятэкі. Работу сумяшчаў у клубе і бібліятэцы Гарнак Канстанцін Філіпавіч. На той час было 50 чытачоў,налічвалася каля 500 экз. Паступова фонд папаўняўся, прыбаўляліся чытачы.

З 1967 па 1976 год ў бібліятэцы і клубе працуе Шадуйкіс Зінаіда Іванаўна, з 1970 па 1976 -Арцюх Людміла, 1976 - 1979 - Гарнак Галіна Іванаўна, 1980-1982г.г.-Бяляева Таццяна Палікарпаўна.



***Гарнак Г. І. (злева), Бяляева Т. П.***

У 1982 годзе па размеркаванню Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума была накіравана Гардзецкая (Ярохава) Святлана Аляксееўна, якая працуе і па цяперашні час.



***Бібліятэкар Ярохава С .А.***

Фонд налічваў 4500 экз., 400 чытачоў. У 2002 годзе было выдзелена іншае памяшканне пад бібліятэку. Зараз асобна знаходзяцца чытальная зала, абанемент, пакой “Беларуская сялянская хатка” і гурток “Чароўная кветка”. У “Беларускай сялянскай хатцы” знаходзяцца прадметы сялянскага побыту: рушнікі, вышыванкі, сурвэткі, адзенне, гліняны і драўляны посуд.



Бібліятэкар праводзіць краязнаўчыя часы, гістарычныя ўрокі. Аформлены альбомы “Радаслоўная роднага краю” і “З крынічак памяці народнай”.

У 1995 годзе пры бібліятэцы быў створаны гурток “Чароўная кветка”. Дзеці састаўляюць букеты, займаюцца фларыстыкай, робяць розныя кампазіцыі з саломкі, сухаквеццяў; Вырабы выкарыстоўваюцца ў якасці падарункаў для чытачоў – пераможцаў масавых мерапрыемстваў.




***Удзельнікі клуба “Чароўная кветка”***

“Выхаванне экалагічных і эстэтычных пачуццяў у чытача”–так называўся семінар які прайшоў уСінягорскай бібліятэцы (2005 г.). Ярохава С. А. падрыхтавала паказальнае мерапрыемства – калейдаскоп “Цветов красою сердце отогреем”.




***Удзельнікі семінара***

Па выніках раённага конкурсу на лепшае добраўпарадкаванне ўстаноў соцкультбыта ў 2008 годзе Ярохава Святлана Аляксееўна заняла першае месца і атрымала тэлевізар. Бібліятэкар вядзе цесную сувязь са школай, частымі гасцямі і ўдзельнікамі з'яўляюцца настаўнікі і вучні Сінягорскай школы. Цікава і весела праходзяць забаўляльна-пазнавальныя праграмы, конкурсы, святы.



***Пастаянныя наведвальнікі бібліятэкі***

## Студзёнкаўская сельская бібліятэка

Пачатак арганізацыі Студзёнкаўскай бібліятэкі адносіцца да 1921 года. Для ўмацавання ідэалагічнай работы пры сельскім савеце была адкрыта ізба-чытальня. Першым бібліятэкарам-ізбачом быў Стрыжнёў Леанід Пятровіч. Чытачоў было 56 чалавек.

У 1961 годзе сіламі калгаснай моладзі быў пастроены Студзёнкаўскі сельскі клуб. Для бібліятэкі было адведзена памяшканне. Загадчыцай стала Жэміс Ніна Іванаўна ( 1960 – 1963 г.г.).



***Бібліятэкар Жэміс Н. І.***

У кожнай вёсцы была створана бібліятэка- перасоўка. Пры бібліятэцы працавала агітбрыгада з 10 чалавек, якая праводзіла шмат мерапрыемстваў, прысвечаных датам Чырвонага каляндара. У самой бібліятэцы праводзіліся чытацкія канферэнцыі, гучныя чытанні, палітінфармацыі.

У 1963 годзе бібліятэкарам стала Пракаповіч Ніна Аляксандраўна (працавала па 1993 год).

### *З успамінаў бібліятэкара Пагарэльскай Ларысы Іванаўны*

Самая высокая ўзнагарода для бібліятэкара – падзяка чытача. Адносіны Пракаповіч Ніны Аляксандраўны да наведвальніка бібліятэкі давала ей адчуванне таго, што і яна што-небудзь значыць у гэтым жыцці. Нават у такой маленькай вёсачцы, як Студзёнка. Заўсёды ў яе знаходзілася для чалавека добрае слова, радасная ўсмешка. Яна заўсёды рассказвала сваім чытачам пра цікавыя кніжкі, раіла аб чым і пра што можна прачытаць у той ці іншай літаратуры. Яна раіла якімі травамі і народнымі сродкамі можна падтрымаць здароўе, заўсёды дзялілася рэцэптамі дамашняй кухні. Ніна Аляксандраўна ніколі не забывалася павіншаваць чытачоў з днём нараджэння, не забывалася пра адзінокіх і пажылых жыхароў. Да яе ішлі і з радасцю, і з турботамі. Яна ўмела кожнага выслухаць і кожнаму дапамагчы ў меру сваіх сіл. Вяскоўцы звалі яе лагодна – наша Ніначка.



***Бібліятэкар Пракаповіч Н. А.***

На 1 студзеня 1978 года фонд састаўляў каля 8 тыс. кніг, абслугоўвалася 320 чытачоў. Кожны дзень бібліятэку наведвала не меней 10 чалавек, праводзіліся цікавыя масавыя мерапрыемствы.

Новае памяшканне было атрымана ў 1990 годзе. Гэта быў аддзельны дарослы і дзіцячы абанемент, чытальная зала.

***Ваш мир – любопытные лица,***
***Внимательные глаза,***
***Где дней мелькают страницы,***
***Звенят детей голоса***

З лістапада 1993 года бібліятэкарам пачала працаваць Пагарэльская Ларыса Іванаўна. Яна захавала і прадоўжыла добрыя традыцыі, укараняла ў практыку дзейнасці інавацыйныя формы работы.



***Бібліятэкар Пагарэльская Л. І.***

У 1998 годзе Студзёнкаўская бібліятэка заняла 2-ое месца па выніках работы за год і была ўзнагароджана Ганаровай граматай аддзела культуры. У 2001 годзе – 2-ое месца ў абласным конкурсе па добраўпарадкаванні. З вясны да позняй восені каля бібліятэкі квітнеюць прыгожыя клумбы.



На базе бібліятэкі праводзяцца выязныя тэматычныя семінары, рыхтуюцца паказальныя мерапрыемствы. Адно з іх: народнае свята “Святы Пакроў зямельку засцілае”.



***“Святы Пакроў зямельку засцілае”***

У 2009 годзе быў арганізаваны семінар “Бібліятэкі аграгарадкоў як цэнтры фарміравання інфармацыйна- культурнага абслугоўвання насельніцтва”, да якога бібліятэкарам была падрыхтавана літаратурна – музычная кампазіцыя “Над Белай Руссю – белы бусел” і экскурсія практыкум “Прыгажосць сваімі рукамі”.



***Удзельнікі семінара***

Пры бібліятэцы доўгі час існуе краязнаўчы клуб “Да родных вытокаў”. Дзейнічаў сямейны клуб “Гармонія”.

Ларыса Іванаўна – адказны добрасумленны работнік. Яе паважаюць як дарослыя, так і дзеці. Таму з задавальненннем прымаюць удзел у розных конкурсах, гульнях, паэтычных кампазіцыях, літаратурна-музычных вечарах, народных святах.



***Народнае свята “Масленка”***

# Ульянавіцкая сельская бібліятэка

18 снежня 1918 года ў Ульянавіцкай воласці была арганізавана камуністычная ячэйка. Пры ёй была адчынена хата-чытальня. Працавала тут бібліятэкарам Алена Андрэеўна Стайнова. Кожны дзень бібліятэку наведвала 10-15 чалавек. У жніўні 1923 года бібліятэка была пераведзена ў лепшае памяшканне.

З 1926 года бібліятэкарам працуе актыўны член РКСМ Пётр Данілаў. Бібліятэку наведвае 385 чытачоў. У 1929 годзе быў арганізаваны калгас. Вясковая моладзь стала праводзіць у бібліятэцы гутаркі, гучныя чытанні, абмеркаванні кніг. Бібліятэкай стаў заведваць камуніст Масюцін. Кніжны фонд на той час налічваў больш за 1 000 экз. Бібліятэкар стаў абслугоўваць пажылых жыхароў кнігай на даму. У 1939 годзе калгас “Ульянавічы” быў прадстаўлены на Ўсесаюзнай выставе ў горадзе Маскве.

Над хатай-чытальняй узялі шэфства чыгуначнікі горада Орша. Яны значна папоўнілі кніжны фонд, які складаў ўжо 2 000 экз.
У час Вялікай Айчыннай вайны бібліятэка была знішчана. У 1944 годзе пасля вызвалення вёскі ў доме Лугаўцова Івана была адчынена бібліятэка. Кніжны фонд быў зусім нязначны. Толькі ў 1946 годзе ён склаў 311 кніг. За год кніжны фонд вырас да 1 079 экз. Ім карысталася каля 250 чытачоў.

У 1958 годзе для клуба і бібліятэкі пабудавана новае памяшканне. У біблятэцы працавалі Дзямешчанка М.В., потым – Шэлапуха Т.А. З 1977 года бібліятэкарам працавала Вандзілоўская Л.М. На той час бібліятэка налічвала больш за 5 000 экз. літаратуры і абслугоўвала 400 чытачоў. Бібліятэка ў гэтым жа годзе ўвайшла у склад Сенненскай ЦБС, стала філіялам №48.

З 1980 года па ліпень 1993 года бібліятэку ўзначальвала Шарковіч Г.К. На час цэнтралізацыі кніжны фонд бібліятэкі налічваў 8734 экз. У 1985 годзе фонд узрос да 10 000 экз. Чытачоў у бібліятэцы стала 570.



***Бібліятэкар Шарковіч Г.К.***

У 1993 годзе на работу ў бібліятэку прыйшла дэпутат сельскага Савета, актывістка Гарбачова Таццяна Сяргееўна, якая працуе і зараз.



***Бібліятэкар Гарбачова Т. С.***

Загадчыца бібліятэкі праводзіць шэраг цікавых мерапрыемстваў. Сваю работу ладзіць сумесна з СПК "Ульянавічы", сельскім Домам культуры, школай. Пры біблятэцы арганізаваны гурток "Умелыя рукі", мэта якога – прывіць любоў і павагу да кнігі і чытання.



***Навінкі літаратуры***

## Ходцаўская сельская бібліятэка

Ходцаўская бібліятэка была створана ў 1922 годзе. Яна знаходзілася ў будынку Ходцаўскага савета. У 1975 годзе была пераведзена ў новы пабудаваны Дом культуры. Для яе было выдзелена невялічкае памяшканне. Потым бібліятэка пашыралася. Зараз яна займае чатыры пакоі, дзе захоўваецца кніжны фонд у колькасці 11 000 экз., працуюць чытальная зала і дзіцячы пакой. Бібліятэка з густам аформлена. Тут шмат пакаёвых кветак.

У 60-я гады ў бібліятэцы працавала Маладоўская Яўгенія Уладзіміраўна. Яна любіла сваю працу і сваіх чытачоў.

Бібліятэку з 1976 года ўзначальвае Паражынская Ларыса Уладзіміраўна, якая набыла сярэднюю бібліятэчную адукацыю завочна. Гэта энтузіяст бібліятэчнай справы. Умее падысці да кожнага чытача, арганізаваць яго вольны час. На працягу доўгага часу Ходцаўская бібліятэка з'яўляецца адной з лепшых у сістэме. У 1992 годзе яе партрэт быў змешчаны на раённым Стэндзе гонару.





*Бібліятэкар Паражынская Л. У.*

У бібліятэцы сабраны вялікі краязнаўчы матэрыял: "Летапіс саўгаса "Ходцы", "Славім салдацкі подзвіг", "Слава людзям працы". Ніколі бібліятэкар не застаецца ў баку ад тых мерапрыемстваў , якія праходзяць у саўгасе , школе або Доме культуры, з'яўляецца вядучай на святах, актыўнай удзельніцай мастацкай самадзейнасці.



*Паражынская Л.У (крайняя справа)*

Ларыса Уладзіміраўна з густам можа параіць чытачам тую або іншую кнігу, расказаць аб аўтары, пазнаёміць з лепшымі творамі літаратуры.




***Кніжныя выставы***

Зараз у бібліятэцы працуе клуб “Сямейны універсітэт”. На базе гэтай установы прайшоў выязны тэматычны семінар для сельскіх бібліятэкараў сістэмы “Сям’ю з’яднае мудрасць кнігі”.



***Тэтралізаванае свята “Усё пачынаецца з сям’і”***



***Сямейнае свята “Солдат умом и силой богат”***



*Конкурс "Лета і кніга"*



*"Яблычны Спас"*

## Яноўская сельская бібліятэка

Бібліятэка ў Янове была арганізавана ў 1930 годзе. Размяшчалася яна ў двухпавярховым жылым доме. Мела фонд 500 экз. Узначальваў яе Сапрыка Якаў Сцяпанавіч, які працаваў на грамадскіх пачатках.



*Сапрыка Якаў Сцяпанавіч, бібліятэкар у 30-ыя гады*

З 1934 года да пачатку вайны бібліятэкарам працаваў Мядзведзеў Пётр Іванавіч.

гады Вялікай Айчыннай вайны бібліятэка была знішчана. Некалькі кніг удалося зберагчы насельнітву вёскі. Само памяшканне згарэла.

Пасля вайны ў сакавіку 1946 года з фронту вярнуўся Цяцюеў Васіль Кірылавіч. Ён стаў працаваць загадчыкам Яноўскага клуба і бібліятэкі. Бібліятэкар збіраў кнігі, афармляў наглядную агітацыю, рабіў стэлажы і сталы. Установа культуры тады знаходзілася ў былым доме памешчыка.



***Першы бібліятэкар пасля вайны Цяцюеў Васіль Кірылавіч***

У 1948 годзе на пасаду бібліятэкара быў прыняты Батоўскі Пётр Мікалаевіч, з 1950 года бібліятэкарам працуе Шарэц Надзея Фёдараўна. У студзені 1952 года яе змяніла Барсукова Марыя Дарафееўна, якая працавала да 1957 года.

З 1957 года па 1 красавіка 1992 года бібліятэчную ўстанову ў в. Янова ўзначальвала Грыгор'ева Клара Іванаўна – энтузіаст культурна-асветніцкай работы, адароны чалавек, удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Яна мела спецыяльную адукацыю. Работа ўстановы актывізавалася. Бібліятэка стала сапраўдным цэнтрам культурна-масавай работы. Тут арганізоўваліся вечары, агляды літаратуры, агеньчыкі. Ёй было прысвоена званне заслужанага дзеяча культуры СССР. Яна мела асаблівы мастацкі густ, падыход да людзей; рыхтавала сваіх чытачоў да ўдзелу ў раённых і абласных конкурсах мастацкай самадзейнасці.



***Грыгор'ева Клара Іванаўна, заслужаны дзеяч культуры СССР***

5 кастрычніка 1967 года быў здадзены ў эксплуатацыю новы тыповы будынак клуба. У ім размясцілася Яноўская сельская бібліятэка, якая ў 1977 годзе ўвайшла ў склад Сенненскай ЦБС (філіял №53).



3 снежня 1992 года на пасаду бібліятэкара была назначана Петравецкая Жана Генадзеўна, якая ў 2004 годзе набыла сярэднюю спецыяльную адукацыю (закончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум імя А.С.Пушкіна).

На базе гэтай бібліятэкі прайшоў семінар “Па высокаму абавязку свайго прызвання” (2006 год). Бібліятэкар прадэманстравала вечар-ушанаванне “Усё ствараецца працай чалавека”.



***Удзельнікі семінара***

У 2007 годзе в. Янова набыла статут аграгарадка. Адрамантаваны клуб і бібліятэка. Зроблены прыгожыя клумбы. На пасаду бібліятэкара Яноўскай бібліятэкі ў 2010 годзе прыйшла працаваць Чубукова Наталля Віктараўна.



***Бібліятэкар Чубукова Н.В.***

Актывізавалася масавая прапаганда кнігі. Пры бібліятэцы стаў дзейнічаць жаночы клуб “Сяброўкі”, які карыстаецца папулярнасцю сярод чытачоў.